Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 КРАСАВІКА 2017 г. АЎТОРАК № 68 (28432)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Як правільна прымаць лазню?

СТАР. 5

Пашпарт для бульбы

СТАР. 11

Спыніць хвалю тэрарызму

СТАР. 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір ГУСАКОЎ, старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук:

«Апошнім часам істотна павысілася акупнасць нашых навуковых даследаванняў. Так, аб'ём выручкі ад рэалізацыі створанай па праграме прадукцыі ў адносінах да аб'ёму выдаткаваных бюджэтных сродкаў дасягае ў цяперашні час больш за BYN100 на BYN1. Яшчэ некалькі гадоў таму было BYN20 і менш. Распрацоўкі беларускіх вучоных прадаюцца больш чым у 60 дзяржавах. Наладжваюць актыўнае ўзаемадзеянне і з новымі партнёрамі».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.04.2017 г.

Долар ЗША	1,9027	▲
Еўра	2,0134	▲
Рас. руб.	0,0331	▼
Укр. грыўня	0,0706	▲

ISSN 1990 - 763X

УГЛЯДАЮЧЫСЯ Ў ВЯСНУ...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Выкладчыца экалагічнага права ў Брэсцкім філіяле БДУ Марыя САМУСЕВІЧ.

■ Падрабязнасці

Жыллё ў арэнду. Фінансавую

Усе нюансы набыцця кватэры ў лізінг

Цяпер у краіне сфарміраваны ўсе прававыя ўмовы для выдачы фізічным асобам у валоданне і карыстанне жылых дамоў і кватэр па дагаворах фінансавай арэнды (лізінгу). Адпаведны ўказ быў падпісаны кіраўніком дзяржавы на мінулым тыдні.

Трэба заўважыць, што сістэма лізінгу жылля фактычна існуе ў Беларусі ўжо на працягу двух гадоў. За мінулы год у лізінг аформлена больш за 50 кватэр, і ўсё ў адной кампаніі — «АСБ Лізінг», якая дзейнічае ў структуры Беларусбанка. Аднак у старой рэдакцыі прававых умоў лізінгу існавала некалькі спрэчных пытанняў, якія тармазілі масавае выкарыстанне насельніцтвам гэтай сістэмы. Напрыклад, жыхары кватэры, якія карысталіся такім жыллём па дагаворы лізінгу, павінны былі аплачваць жыллёва-камунальныя паслугі па тарыфах для юрыдычных асоб, бо нерухомасць да поўнага разліку за яе знаходзіцца ва ўласнасці лізінгавай кампаніі. А камуналка для юрасоб даволі дарагая.

Як паведаміў на брыфінгу ў прэс-цэнтры БЕЛТА **начальнік упраўлення рэгулявання нябанкаўскіх аперацый Нацыянальнага банка Дзмітрый НАБЗДОРАЎ**, у прынятым дакументе да карыстальнікаў жылля па лізінгу прымяняюцца тарыфы на жыллёва-камунальныя паслугі, устаноўленыя для насельніцтва.

Пакуль не разлічыўся — не тваё

У чым розніца паміж лізінгам і купляй кватэры ў крэдыт? Калі вы купляеце кватэру ў крэдыт, яна — адразу ваша, хоць і ў закладзе ў банка. Калі бераце ў лізінг, то нерухомасць належыць лізінгадаўцу да самага апошняга плацяжу.

Дзмітрый Набздораў паведаміў, што ва ўказе №109 не прапісаны мінімальны і максімальны тэрмін такога лізінгу. Зразумела, што ён не можа быць меншы за год — інакш гэта не фінансавы лізінг. Але меж па максімальным тэрміне няма, таму кожная камерцыйная кампанія вызначыць іх для сябе самастойна. Прадстаўнік Нацбанка адзначыў, што цяпер на практыцы дагаворы могуць быць прапанаваны з тэрмінам ад 10 да 25 гадоў.

СТАР. 3

■ Рынак працы

ІНІЦЫЯТЫЎНАСЦЬ, ГНУТКАСЦЬ, МАБІЛЬНАСЦЬ

Якімі кампетэнцыямі павінны валодаць маладыя спецыялісты?

У Аркадзя Райкіна была некалі вельмі папулярная мініяцюра. Артыст прыходзіць да дырэктара атэльле і спрабуе высветліць, хто пашыў яму крывы касцюм. «— Мы! — Хто гэта «мы»? — У нас вузкая спецыялізацыя. Адзін прышывае кішэню, адзін — пройму, я асабіста прышываю гузікі. Да гузікаў прэтэнзіі ёсць?» Да гузікаў прэтэнзій няма, але касцюм — крывы!!!

Гэту гісторыю прыгадаў, выступаючы на жнівеньскай педагагічнай канферэнцыі, старшыня Мінгарвыканкама Андрэй Шорац. «Нам сёння трэба «вучыць не таго, каго ўмеем, а таго, хто патрэбны, — падкрэсліў ён. — Дырэктар МТЗ расказаў, што ўвёў сістэму прыёму выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў з патрабаваннем наяўнасці сярэдняга бала не ніжэйшага за «8». Да яго прыйшлі 11 чалавек, больш іх проста няма. Гэта сведчыць аб тым, што мы не падрыхтавалі, не выхавалі, не вывучылі добрага інжынера, маркетолага, эканаміста... Калі маладыя спецыялісты прыходзяць на вытворчасць пасля заканчэння навучальнай установы, першае, што яны чуюць, — параду «забудзьцеся ўсё, чаму вас вучылі». Але чамусьці нікога не засмучае гэта акалічнасць...»

Назад у мінулае?

Каго сёння трэба рыхтаваць для рынку працы і якімі кампетэнцыямі павінны валодаць на выхадзе з установы адукацыі выпускнікі, каб быць запатрабаванымі наймальнікамі, — адказы на гэтыя пытанні сёння шукаюць не толькі ў нашай краіне. У лістападзе мінулага года ў Політэхнічным універсітэце г. Валенсія (Іспанія) быў дадзены старт новаму міжнароднаму праекту FOSTERC у рамках праграмы Эразмус +. Праект рэалізуецца кансорцыумам у складзе 15 партнёраў з Іспаніі, Літвы, Польшчы, Фінляндыі і Беларусі.

СТАР. 4

ВЯЛІКІЯ ЗАДАЧЫ, ЯКІЯ ТРЭБА ВЫРАШЫЦЬ РАЗАМ

Беларусь і Кітай паглыбляюць супрацоўніцтва ў праваахоўнай сферы

Звычайна ўзровень стратэгічнага супрацоўніцтва паміж дзяржавамі лічыцца самым высокім: партнёры не проста давяраюць адно аднаму і актыўна нарошчваюць тавараабарот, але і рэалізуюць шэраг сумесных праектаў у розных сферах, рэалізуюць сумесныя ініцыятывы на міжнароднай арэне... Беларусь і Кітай ужо пераадолелі гэтую прыступку, і з мінулага года наша супрацоўніцтва носіць яшчэ больш цесны характар — давернага ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. А ў любых краін-партнёраў амаль заўсёды на першых пазіцыях у парадку супрацоўніцтва знаходзяцца дзве тэмы: эканоміка і бяспека.

Учора Прэзідэнт Беларусі правёў дзве сустрэчы з прадстаўнікамі Кітайскай Народнай Рэспублікі — з членам Дзяржсавета КНР, міністрам грамадскай бяспекі Го Шэнкунем і з членам Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі і Генеральным пракурорам Вярхоўнай народнай пракуратуры КНР Цаа Цзяньмінам. З улікам нядаўніх падзей у рэгіёне супрацоўніцтва ў праваахоўнай сферы становіцца актуальным як ніколі. Беларусі і Кітаю ёсць чаму павучыцца адно ў аднаго.

— Ваш прыезд знакавы, — падкрэсліў Прэзідэнт, вітаючы міністра грамадскай бяспекі КНР. — Здавалася б, і адлегласць вялікая паміж нашымі дзяржавамі, і ў былыя часы сказалі б: ну якія могуць быць агульныя пытанні ў сферы праваахоўнай дзейнасці? Нічога падобнага, часы змяніліся. Свет стаў вельмі цесным, злачыннасць — інтэрнацыянальнай. Таму перад намі вельмі вялікія задачы, якія мы павінны рашаць разам.

Мы ўжо даволі грунтоўна супрацоўнічаем. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ідзе сур'ёзны ператок людзей: беларусы едуць у Кітай, грамадзяне Кітая — у Беларусь.

— Мы вельмі шмат будуем сумесных прадпрыемстваў у Кітаі, і асабліва тут, у Беларусі працуе вельмі шмат грамадзян з Кітая. Натуральна, з усімі станоўчымі і негатыўнымі тэндэнцыямі ў нашых краінах ідзе ператок праблем. Таму ўзнікае неабходнасць больш актыўнай, цеснай работы праваахоўных ведамстваў.

Асабліва нашу дзяржаву цікавіць вопыт Кітая ў арганізацыі і правядзенні Алімпійскіх гульняў у 2008 годзе. Зусім хутка ў нашай краіне таксама пройдзе вельмі масавае спартыўнае мерапрыемства — II Еўрапейскія гульні:

— Ваш вопыт для нас будзе вельмі важным. Мы вялікую ўвагу асабліва зараз удзяляем новым выклікам, якія з'явіліся, і некаторым старым праблемам, якія абвастрыліся, такім як экстрэмізм, тэрарызм, сепаратызм. Гэта тыя тры бяды, супраць якіх Кітайская Народная Рэспубліка вядзе актыўную барацьбу. Кіберзлачыннасць, актыўная міграцыя... Па гэтых кірунках нам яшчэ трэба будзе выпрацаваць сур'ёзныя мерапрыемствы для актыўнага супрацоўніцтва. Словам, праблем нямала, таму і работы для праваахоўнікаў дзвюх нашых краін будзе таксама вельмі многа. Мы да гэтага гатовы, спадар міністр.

Го Шэнкунь падзякаваў за магчымасць сустрэцца і перадаў прывітанне і найлепшыя пажаданні ад Старшыні КНР Сі Цзіньпіна.

Падчас сустрэчы з Генеральным пракурорам Вярхоўнай народнай пракуратуры КНР Прэзідэнт канстатаваў:

— У нас устанавіліся вельмі цесныя адносіны не толькі з кіраўніцтвам вашай дзяржавы, Старшынёй Кітайскай Народнай Рэспублікі, але і вельмі добрыя адносіны на міжведамасным узроўні. Гэта датычыцца і супрацоўніцтва нашых генеральных пракурораў. Як мне пракурор дакладвае, у нашых пракуратур вельмі добрыя адносіны. А калі ўлічваць у прынцыпе аднатыпныя пазіцыі, аднатыпныя задачы, якія вырашае пракуратура ў нас і ў вас, для нас набывае вельмі важнае значэнне супрацоўніцтва з вамі, паколькі вы валодаеце вельмі багатым і рознабаковым вопытам. У вас каласальны вопыт назапашаны.

З узнікненнем новых відаў злачыннасці, новых выклікаў бяспецы пракуратурам важна падтрымліваць кантакты.

— Арганізаваная злачыннасць і карупцыя носяць больш дасканалыя формы, муціруюць, калі можна так сказаць, гэтыя з'явы, а генеральныя пракуроры, пракуратура ў вас і ў нас з'яўляюцца органамі, якія каардынуюць дзейнасць праваахоўных органаў па ўсіх кірунках — у тым ліку і па названых. Таму мы збіраемся актывізаваць наша супрацоўніцтва па кірунках барацьбы са злачыннасцю, каардынацыі гэтых дзеянняў. Думаю, што для Кітайскай Народнай Рэспублікі гэта таксама будзе неабходна і карысна.

Надзея ЮШКЕВІЧ.
yushkevich@zviazda.by

■ Парламенцкі дзённік

ПАКІСТАНСКІЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

Беларуская дэлегацыя на чале са спікерам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімірам АНДРЭЙЧАНКАМ з афіцыйным візітам знаходзіцца ў Пакістане. Акрамя парламентарыяў, у Ісламабад накіраваліся прадстаўнікі дзяржорганаў і дзелавых колаў.

Як паведамляе прэс-служба ніжняй палаты, учора адбылася сустрэча Уладзіміра Андрэйчанкі са спікерам Нацыянальнай асамблеі парламента Пакістана Сардарам Аязам Садзікам.

Пакістанскі спікер падкрэсліў, што яго краіна надае выключна вялікае значэнне візіту беларусаў. Падчас перагавораў было абмеркавана шырокае кола пытанняў двухбаковага парадку, якія датычацца ўмацавання гандлёва-эканамічных сувязяў і развіцця дзелавых кантактаў з улікам дамоўленасці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі і прэм'ер-міністра Пакістана Наваза Шарыфа давесці да 2020 года аб'ём узаемнага тавараабароту да аднаго мільярда долараў ЗША.

«Уладзімір Андрэйчанка і Сайдар Садзік выказалі ўзаемнае разуменне таго, што развіццё поўнафарматнага ўзаемадзеяння Беларусі і Пакістана немагчымае без усталявання і нарошчвання эфектыўнага міжпарламенцкага дыялогу, — інфармуе прэс-служба Палаты прадстаўнікоў. — Абодва бакі выказалі зацікаўленасць у падтрымцы супрацоўніцтва ў галіне аграпрамысловага комплексу. У гэтым плане падкрэслена значнасць правядзення 11 красавіка бягучага года ў Ісламабадзе першага Беларуска-Пакістанскага сельскагаспадарчага форуму».

У гэты ж дзень прайшла сустрэча Уладзіміра Андрэйчанкі з міністрам нацыянальнай харчовай бяспекі і даследаванняў Пакістана Хасанам Басанам.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■ Акцэнты тыдня

СВЕТУ НЕАБХОДНА ЗГУРТАВАННЕ

Атака на Сірыю з боку ўзброеных сіл ЗША ў ноч на 7 красавіка стала самай шакіруючай навіной тыдня. Яе прычыну цяжка назваць рацыянальнай. Паводле абвешчанай версіі Вашынгтона, армія Прэзідэнта Асада нібыта не знайшла нічога лепшага, як выкарыстаць забароненую хімічную зброю для атакі грамадзянскіх асоб у сірыйскай правінцыі Ідліб. З пункту гледжання цвярозага сэнсу гэта абвінавачанне не вытрымлівае ніякай крытыкі. Выкарыстанне хімічнай зброі ў Сірыі, што прыпісваецца ўраду, ужо аднойчы выклікала пагрозу атакі ЗША ў 2013 годзе, пасля чаго былі прыняты захады да вывазу і знішчэння ўсіх старых арсеналаў з тэрыторыі, якая кантралюецца сірыйскім урадам, за мяжу для знішчэння. Сітуацыя ўнутры Сірыі з тых часоў вельмі рэзка змянілася на карысць Асада. Пры падтрымцы Расіі і Ірана вызвалена значная частка тэрыторыі краіны, Ісламская дзяржава вельмі аслаблена ўдарамі Расіі і заходняй кааліцыі як на тэрыторыі Сірыі, так і Ірака. ЗША ўпершыню з 2011 года заявілі пра тое, што не вядуць барацьбу супраць Асада, і магчымыя сцэнарыі, пры якіх ён можа застацца пры ўладзе. Выкарыстоўваць у такой сітуацыі хімічную зброю мог бы толькі вар'ят. Дзве рэальныя версіі здарэння простыя. Альбо хімічная зброя была выкарыстана паўстанцамі, каб прымусіць ЗША ўмяшацца ў канфлікт на іх баку, альбо сітуацыя была арганізавана адным з саюзнікаў ЗША, каб ператварыць барацьбу супраць Ісламскай дзяржавы ў барацьбу супраць Асада.

Яшчэ адной негатыўнай навіной тыдня стала **абмеркаванне вядучымі заходнімі краінамі новых санкцый супраць Расіі за падтрымку Асада**, які нібыта выкарыстаў хімічную зброю. Пра гэта заявіла ў нядзелю пастаянны прадстаўнік Злучаных Штатаў пры ААН Нікей Хейлі. Таксама газета The Times паведаміла, што брытанскі міністр замежных спраў Борыс Джонсан будзе патрабаваць на пасяджэнні кіраўнікоў МЗС G7, якое пройдзе ў Італіі, вельмі жорсткіх санкцый супраць Расіі як пакаранне за хімічную атаку на кантраляванай паўстанцамі тэрыторыі. Магчымае далейшае ўзмацненне жорсткасці санкцый супраць Расіі з'яўляецца дрэннай навіной. Расія і так значна страціла з прычыны ўжо ўведзеных санкцый і спадарожных мер, і новыя санкцыі могуць толькі павялічыць яе рашучасць выкарыстоўваць усе магчымыя меры для змены сітуацыі, але не ісці на повадзе ў Захаду.

Яшчэ адной навіной, якая не можа не павялічыць занепакоенасць ростам геапалітычнага напружання ў свеце, з'яўляецца **рашэнне адправіць ударную групу Ваенна-марскіх сіл ЗША ў раён Карэйскага паўвострава**. Група караблёў на чале з атамным авіяносцам Carl Vinson накіравалася ў рэгіён з Сінгапура. Афіцыйная прычына — занепакоенасць ЗША адносна нарошчвання КНДР ваеннага патэнцыялу. На фоне ракетнага ўдару па Сірыі ў многіх экспертаў узніклі падазрэнні, што прычына іншая. Ёсць рызыка, што задачай ударнай групоўкі разам з ужо назапашаным ваенным патэнцыялам ЗША ў рэгіёне на тэрыторыі Паўднёвай Карэі і Японіі з'яўляецца атака на Паўночную Карэю. Улічваючы той факт, што ў КНДР назапашаны пэўны ядзерны патэнцыял, пры такім сцэнарыі магчымы варыянт першага ў свеце выкарыстання ядзернай зброі пасля 1945 года. Яна можа быць выкарыстана ў першай атацы ЗША на Паўночную Карэю, каб нанесці знішчальны ўдар, улічваючы дастаткова простыя адносіны новага амерыканскага лідара да ядзернай зброі (калі яна ёсць, то яе можна выкарыстоўваць), ці Паўночнай Карэяй пасля атакі ЗША звычайнымі сродкамі.

На фоне гэтых навін **два сур'ёзныя тэрарыстычныя акты** — у метро Санкт-Пецярбурга і ў Стакгольме — не змаглі аб'яднаць Еўропу, прымусіўшы забыцца пра менш важныя рэчы на фоне агульнай праблемы з тэрарызмам. Падчас выбуху ў метро загінула 14 чалавек, дзясяткі былі параненыя. Тэракт у Стакгольме прайшоў па жахлівым сцэнарыі, які стаў ужо звыклым, калі грузавік выкарыстоўваецца для таго, каб забіваць мірных пешаходаў, у выніку чаго загінула 4 чалавекі. Між тым пры розных сцэнарыях ёсць аб чым задумацца. Абодва яны магчыма былі ўчынены выхадцамі з краін Цэнтральнай Азіі, у Санкт-Пецярбургу метро, як мяркуецца, падрываў выхадзец з Кыргызстана, у Стакгольме людзей душыў, магчыма, выхадзец з Узбекістана. Свету варта было б звярнуць пільную ўвагу на тое, наколькі эфектыўна радыкалы ажыццяўляюць сваю падрыўную работу на тэрыторыі Цэнтральнай Азіі, і паставіць перашкоды на іх шляху. Але для гэтага неабходна згуртаванне вядучых палітычных сіл, на што былі надзеі, калі Трамп, ідучы на выбары, дэкларавуў сваю будучую знешнепалітычную праграму дзеянняў, ад якой пасля выбараў з лёгкасцю адмовіўся.

Сяргей КІЗІМА,
доктар палітычных навук

■ З нагоды

НАДЗЕЙНАЯ АПОРА ДЗЯРЖАВЫ

Воіны-інтэрнацыяналісты па-ранейшаму будуць адстойваць нацыянальныя інтарэсы

Больш як 300 дэлегатаў з усёй краіны сабралася днямі падчас IX з'езда Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане. Падвёўшы вынікі сваёй дзейнасці за папярэдні перыяд, воіны-інтэрнацыяналісты абмеркавалі надзённыя праблемы і вызначыліся з планамі на наступную пяцігодку.

— Наша арганізацыя запатрабавана часам і грамадствам, — перакананы **старшыня Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане генерал-маёр запасу Валерый ГАЙДУКЕВІЧ.** — Мэты і задачы Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане супадаюць з праграмай «За моцную і квітнеючую Беларусь». Мы за такую дзяржаву, у якой сацыяльна абаронены ўсе грамадзяне, дзе павагай карыстаюцца ветэраны. Мы, воіны-інтэрнацыяналісты, былі і будзем надзейнай апорай дзяржавы, адстойваючы нацыянальныя інтарэсы краіны, захоўваючы яе цэласнасць і незалежнасць.

Адной з прыярытэтных задач грамадскага аб'яднання па-ранейшаму застаецца патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення. «Хто, калі не мы, не толькі асабістымі прыкладамі, а і справамі будзе вучыць моладзь адносінам да жыцця, свайму месцу ў грамадстве, вучыць дабрыні і любові да сваёй Радзімы, гатоўнасці адстойваць тэрытарыяльную цэласнасць краіны?» — падкрэсліў старшыня Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане.

Не новая для грамадскага аб'яднання і такая задача, як дапамога тым, хто мае ў гэтым патрэбу. Як адзначылі на з'ездзе, большасць воінаў-афганцаў — самадастатковыя людзі, але ёсць тыя, каму трэба дапамагчы. У першую чаргу гэта датычацца пытанняў пенсійнага забеспячэння ветэранаў баявых дзеянняў з ліку салдат і сяржантаў тэрміновай службы, асабліва інвалідаў, якія не мелі працоўнага стажу да прызыву. Закраналіся падчас з'езда і пытанні медыцынскага абслугоўвання інвалідаў, клопату аб бацьках і ўдовах загінулых у Афганістане.

Па словах **старшыні савета Мінскай гарадской арганізацыі ветэранаў вайны ў Афганістане «Памяць» Уладзіміра ШОКАВА**, сёння ідзе работа над удасканаленнем закона «Аб ветэранах», які будзе прыняты ў новай рэдакцыі. «Прайшло 25 гадоў з моманту прыняцця закона, многія яго артыкулы ўжо неактуальныя, — гаворыць старшыня гарадской арганізацыі. — Напрыклад, прадугледжана павышэнне статусу ўдзельнікаў баявых дзеянняў, у тым ліку інвалідаў».

— Акрамя таго, што з'езд дае магчымасць падвесці вынікі работы афганскіх арганізацый, абмеркаваць актуальныя пытанні, гэта яшчэ і радасная сустрэча сяброў, — лічыць **дырэктар дабрачыннага фонду дапамогі воінам-інтэрнацыяналістам «Памяць Афгана» Аляксандр МЯТЛА**. — У той жа час нельга сказаць, што мы не маем зносін на працягу пяці гадоў. Ёсць пытанні — мы збіраемся і вырашаем іх. Наш фонд увогуле працуе з людзьмі індывідуальна.

Дарэчы, упершыню на з'ездзе ветэранаў вайны ў Афганістане прысутнічалі дзеці тых, хто дамоў з той вайны не вярнуўся. Бацька Андрэя Млявага загінуў у Афганістане ў 1985 годзе. Амаль за тры месяцы лётчык-верталётчык здзейсніў 117 баявых вылетаў, быў узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Чырвонага Сцяга. Пасмяротна. Сын воіна-інтэрнацыяналіста, які ў 12 гадоў застаўся без бацькі, як ніхто ведае цану міру, таму на канкрэтным прыкладзе вучыць сваіх дачок любіць Радзіму.

У канцы з'езда дэлегаты выбралі новы савет Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане. Па выніках галасавання, старшынёй грамадскага аб'яднання застаўся Валерый Гайдукевіч. Для яго, воіна-інтэрнацыяналіста, не чужыя праблемы ветэранаў вайны ў Афганістане, і як вопытны кіраўнік, ён ведае, як іх вырашаць.

Вераніка КАНЮТА. *kanyuta@zviazda.by*

Вайна адабрала ў іх дзяцінства

Сёння ў Магілёве зноў будуць успамінаць малалетніх вязняў фашысцкіх лагераў. Да помніка «Дзецям вайны» ў Магілёве лягуць кветкі, а людзі на хвіліну замруць у маўчанні, каб аддаць даніну памяці нявінным ахвярам Вялікай Айчыннай вайны. Па традыцыі ў мітынгу прымаюць удзел прадстаўнікі ўлады, грамадскіх арганізацый, сведкі тых жахлівых падзей, ветэраны вайны, моладзь.

Па словах **старшыні Магілёўскай абласной асацыяцыі малалетніх вязняў фашысцкай няволі Уладзіміра ПАРАХНЕВІЧА**, сёння ў абласным цэнтры пражывае каля 640 малалетніх вязняў. Гэта тыя, хто нарадзіўся ў перыяд з 1927 па 1945 год. На тэрыторыі Магілёўскай вобласці ў гады вайны дзейнічала 130 лагераў, гета і іншых месцаў прымусовага ўтрымання людзей. У іх было знішчана каля 152 тысяч чалавек. Самай жахлівай фабрыкай смерці ў Магілёве быў Лупалаўскі канцлагер (шталаг №341), дзе з 1941 па 1943 год было закатавана звыш 40 тысяч чалавек. Сёння вядомы імёны толькі некалькіх сотняў з іх.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

■ Наўздагон

На беларускіх станцыях цягнік сустракалі медыкі

8 красавіка позна ўвечары на перагоне Філі — Кунцава-1 Беларускага напрамку Маскоўскай чыгункі адбылося сутыкненне прыгараднага цягніка №6919 Масква — Усава з пасажырскім цягніком №3 зносінамі Масква — Брэст. У выніку здарэння сышлі з рэек два вагоны электрычкі і секцыя лакаматыва пасажырскага цягніка.

На момант сутыкнення ў цягніку знаходзілася 450 пасажыраў. Па інфармацыі МНС Расіі, 13 з іх былі накіраваны ў медыцынскія ўстановы. Пасля завяршэння аднаўленчых работ цягнік працягнуў рух.

У сувязі з тым, што адбылося, цягнік №3 Масква — Брэст прыбыў у Брэст са спазненнем на 5 гадзін 1 хвіліну, цягнік №1 Масква — Мінск прыбыў у Мінск са спазненнем на 2 гадзіны 56 хвілін. Пасажыраў цягніка №3 на працягу ўсяго шляху суправаджала брыгада медыцынскіх работнікаў. На чыгуначных вакзалах у Оршы, Мінску, Баранавічах і Брэсце цягнік сустракалі брыгады медыцынскай хуткай дапамогі. Для дадатковага абследавання шэсць пасажыраў у Мінску і два ў Баранавічах былі дастаўлены ў медыцынскія ўстановы, паведамілі ў прэс-цэнтры магістралі. Шасцёра расіян, якіх шпіталізавалі ў сталіцы, пасля атрымання меддапамогі неўзабаве былі адпушчаны з клінік.

Пытанне дастаўкі грамадзян Беларусі, накіраваных у медыцынскія ўстановы Масквы, знаходзіцца на кантролі ў Беларускай чыгункі.

Адзін з пасажыраў цягніка Масква — Брэст, што сутыкнуўся з электрычкай у расійскай сталіцы, расказаў пра падрабязнасці інцыдэнту «Звяздзе».

— У гэтым цягніку я вяртаўся дадому з Масквы, узяў білет у плацкартны вагон (ён, дарэчы, быў цалкам запоўнены), — згадвае Раман ВОЛАЗНЕЎ. — У момант сутыкнення наш састаў не рухаўся, я сядзеў на ніжняй паліцы. Без пераболшанняў, два ўдары былі вельмі моцнымі, нават не ведаю, з чым іх можна параўнаць. Скажу толькі, што мяне адкінула ў сценку з такой сілай, што я адляцеў ад яе назад. Адразу ж адкрыўся інтэнсіўны крывацёк, таму я нават не памятаю, якія пашкоджанні атрымалі суседзі па вагоне. Практычна імгненна мяне забралі на «хуткай» у НДІ імя Скліфасоўскага, дзе ўрачы дыягнаставалі некалькі рассячэнняў і наклалі тры швы. Іх, праўда, аказалася недастаткова. Учора Расійская чыгунка выплаціла мне грошы за зваротны білет, я вярнуўся ў Мінск і цяпер знаходжуся ў бальніцы — буду далечвацца на радзіме. Наколькі я ведаю, ужо з'явілася нейкая інфармацыя пра кампенсацыі, што будуць выплачаны пацярпелым, але я пакуль не цікавіўся гэтым, галоўнае для мяне цяпер — вырашэнне пытанняў са здароўем.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by
Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

■ Надвор'е

ХОЛАД СА СКАНДЫНАВІІ

Навальніца, парывісты вецер і нават град

У другой дэкадзе ўжо не будзе так цёпла, як раней. А на гэтым тыдні чакаецца няўстойлівае надвор'е з тэмпературным фонам, блізкім да кліматычнай нормы, паведамляе намеснік начальніка службы метэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Святлана РЫБАКОВА.

Холад са Скандынавіі пачне гаспадарыць на тэрыторыі Беларусі ў сераду ўжо па поўнай праграме. Уначы пераважна па паўночна-ўсходняй частцы краіны чакаюцца кароткачасовыя ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. А ўдзень у паўночна-заходніх і цэнтральных раёнах пройдуць толькі кароткачасовыя дажджы. Прагназуецца, што тэмпература паветра ўначы на сераду панізіцца да мінус 2 — плюс 4 градусаў, а ўдзень будзе ад плюс 6 да плюс 12 градусаў. Чарговая сістэма франтальных раздзелаў з боку Заходняй Еўропы прынясе на тэрыторыю краіны кароткачасовыя дажджы і ў чацвер. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—8 цяпла, удзень чакаецца ад плюс 7 да плюс 13 градусаў, а па паўднёвым усходзе будзе да 15 цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных спецыялістаў, бліжэй да выхадных да нас пачнуць паступаць няўстойлівыя паветраныя масы з паўночна-заходніх раёнаў Расіі. Таму ў пятніцу на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць кароткачасовыя ападкі, у асноўным у выглядзе дажджу. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да мінус 1 — плюс 5 градусаў, удзень будзе толькі 3—10 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

Жыллё ў арэнду. Фінансавую

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Можа, нехта прыйдзе з прапановай тэрміну лізінгу і большым, у свеце сустракаецца і 30-гадовы тэрмін. Таму ўказам урэгулявана пытанне атрымання ў спадчыну і пераходу правоў лізінгаатрымальніка ў выпадку смерці да членаў яго сям'і», — растлумачыў ён.

Дарэчы, у лізінг можна ўзяць як кватэру, так і аднакватэрны дом (катэдж) і нават дачны домік. А вось дзяржаўнае жыллё не будзе разглядацца ў якасці прадмета лізінгу, паведаміў **начальнік аддзела рэгулявання лізінгавай дзейнасці ўпраўлення рэгулявання нябанкаўскіх аперацый Нацыянальнага банка Аляксандр ДЗЯДКОЎ**. Пры гэтым ён растлумачыў, што ва ўказе ёсць асобная норма, паводле якой, калі лізінгаатрымальнік набывае дом або кватэру ва ўласнасць, то ён мае права прэтэндаваць на зямельны ўчастак, дзе стаіць аб'ект лізінгу, як на ўласнасць. Спецыяліст расказаў, што па ўказе лізінгаатрымальнікамі могуць быць грамадзяне Беларусі і замежнікі, якія пастаянна пражываюць у краіне. Пры гэтым апошнія не могуць мець зямлю ва ўласнасці. «Ім будуць перадавацца правы карыстання, арэнды і іншыя маёмасныя правы, якія акрамя права ўласнасці ёсць у Беларусі», — паведаміў ён.

Аляксандр Дзядкоў нагадаў, што прадметам лізінгу могуць быць аднакватэрныя жылыя дамы або кватэры, адзінае выключэнне — пакой. «Пры гэтым права ўласнасці застаецца ў лізінгавай арганізацыі, а права карыстання і валодання — у лізінгаатрымальніка», — адзначыў ён.

Разам з тым гаспадар жылля з лізінгам можа не проста свабодна жыць у такой кватэры, але і рабіць там рамонт, прапісваць жонку (мужа), дзяцей і бацькоў. Калі лізінгаатрымальнік памрэ, то нехта з членаў яго сям'і мае права перазаключыць дагавор лізінгу на сябе на тых жа ўмовах.

І новабудоўлю, і немаладую кватэру

Цікава, а якую кватэру і дзе можна набыць па гэтай схеме? Абмежаванняў тут не існуе, а справа толькі ў фінансавых магчымасцях кліента. Так, летась палова аформленых у лізінг кватэр мела мінскую прапіску, а астатнія — у абласных цэнтрах. Лічыцца, што лізінгаатрымальнік сам выбірае сабе кватэру — на другасным рынку або гатовую новабудоўлю. Потым ён звяртаецца да кампаніі, якая і купляе гэтую нерухомасць. Фірма заключае дагавор лізінгу з кліентам і перадае яму кватэру. Ужо цяпер вядома, што лізінгавыя кампаніі плануюць актыўна супрацоўнічаць напрамую з забудоўшчыкамі і набываць у іх новабудоўлі са зніжкамі за опт.

Пры састаўленні дагавора на лізінг кампанія не патрабуе ад кліента вялікай колькасці даведак і паручыцеляў. Гэта зразумела, бо ў выпадку, калі кватэра ўжо знаходзіцца ва ўласнасці лізінгавай кампаніі, зніжаецца патрэба ў дадатковым забеспячэнні. Як і пры набыцці ў крэдыт, патрэбен будзе першапачатковы ўзнос. Звычайна гаворка ідзе пра суму ў 20—30% кошту кватэры, але ўзнос можа быць і менш — па дамоўленасці з лізінгавай кампаніяй. Аднак ва ўказе прапісана, што максімальны памер стартавага ўзносу не павінен перавышаць 40% ад цаны жылля. Будуць улічвацца і даходы лізінгаатрымальніка, і членаў яго сям'і. І тут дзейнічае агульнае з банкамі правіла, калі штомесячная выплата за карыстанне кватэрай не павінна перавышаць паловы зарплаты (даходаў).

Пра працэнты і заробкі

Ва ўказе не прапісана, пад які працэнт прапануецца кліентам набытае лізінгавай кампаніяй жыллё. Гэта можа быць фіксаваная стаўка, прывязаная толькі да стаўкі рэфінансавання, або ўвогуле плаваючая стаўка, якая залежыць ад нейкіх іншых фактараў (напрыклад, ад узроўню інфляцыі). «Калі запрацуе ўказ, кампаніі для сябе вызначаць, які інструмент ім цікавы, і падрыхтуюць прапановы рынку. Стаўка можа быць нават гібрыднай. Падпісваючы дакумент, чалавек згаджаецца з яго ўмовамі, таму вельмі важна ўважліва чытаць дагавор да яго падпісання, бо потым яго ў любым выпадку давядзецца выконваць», — адзначыў Дзмітрый Набздораў.

Дырэктар акцыянернага таварыства «АСБ Лізінг» Сяргей ЦЕРАХ паведаміў, што ў іх усе выплаты ажыццяўляюцца выключна ў беларускіх рублях. Па ўжо заключаных дагаворах у іх кампаніі сістэма выплат такая: першыя два гады — стаўка па крэдыце роўная стаўцы рэфінансавання Нацбанка, потым да канчатковых разлікаў — стаўцы рэфінансавання (СР) плюс 2%. Сёння СР складае 15%, але Нацбанк з 19 красавіка збіраецца знізіць яе да 14% гадавых.

Якія павінны быць заробкі? Прыкладныя падлікі спецыялістаў паказваюць, што калі выбраць кватэру за 100 тысяч рублёў, аплаціць першы ўзнос у памеры 20%, а далей плаціць роўнымі долямі, то штомесячны плацеж складзе каля 900 рублёў. Калі плаціць з памяншэннем, то самы вялікі плацеж будзе 1300 рублёў на месяц. Атрымліваецца, што ў першым выпадку зарплата (даход) кліента і членаў яго сям'і павінна быць не меншая за 1800 рублёў, у другім — 2600 рублёў на месяц.

Без дадатковых плацяжоў і павелічэння выплат

Дзмітрый Набздораў паведаміў, што ўказам прадугледжана норма, якая даволі сур'ёзна абараняе правы лізінгаатрымальнікаў. Напрыклад, калі мяняюцца цэны на рынку нерухомасці, стаўкі на арэнду кватэр, іншыя ўмовы, якія непасрэдна не ўплываюць на расходы лізінгавай кампаніі, то ў такім выпадку кошт жылля і памер выплат у дагаворы лізінгу пераглядацца не можа. Напрыклад, праз тры гады істотна падаражэла гэта жыллё на рынку, аднак яно не змяніла сваю цану для кліента сістэмы лізінгу. Але калі яно і патаннее, то выплаты меншымі не стануць.

Прадстаўнік Нацбанка растлумачыў, што памер плацяжоў можа мяняцца толькі тады, калі з'яўляюцца нейкія акалічнасці, якія непасрэдна ўплываюць на выдаткі кампаніі. У гэтым выпадку будзе заключацца дадатковае пагадненне, каб змяніць параметры здзелкі. Скажам, калі зніжаецца стаўка рэфінансавання — памяншаюцца плацяжы, павялічваецца — плацяжы таксама павялічваюцца.

Што будзе, калі ў кліента з лізінгам пачалася чорная паласа і ён не мае магчымасці плаціць як раней? Тут трэба ісці дамаўляцца, тлумачыць, што ў вас часовыя фінансавыя цяжкасці. Кампанія можа даць адтэрміноўку аплаты асноўнага доўгу, разгледзець яшчэ нейкія варыянты. У прынцыпе, лізінгавай кампаніі, як і банку, нявыгадна адбіраць жыллё, а потым займацца высяленнем і продажам. Гэта зусім ужо крайняя мера.

У сістэме лізінгу часткі кошту аплачанага жылля пры скасаванні дагавора па віне кліента яму вернуць не заўсёды. Дзмітрый Набздораў кажа, што па гэтым пытанні ёсць асобная норма ва ўказе. «Калі чалавек кампенсаваў 50% і больш кошту кватэры або дома, тады пачынае працаваць наступны механізм: аб'ект лізінгу прадаецца, кампаніі вяртаецца сума, якую ёй недаплаціў лізінгаатрымальнік, а рэшту грошай вяртаюць кліенту», — растлумачыў ён. Калі ж дагавор скасоўваецца па віне лізінгадаўца, то чалавеку будзе кампенсавана ўсё, што ён уклаў.

Гэта самы жорсткі варыянт, але ва ўказе ёсць пункт пра тое, што можа быць зменены лізінгаатрымальнік. «Калі чалавек не можа выконваць дагавор, але ёсць ахвотны жыць у кватэры, якая была перададзена па лізінгу, на ўмовах, прапісаных у дагаворы, то можна перазаключыць дагавор з трэцяй асобай са згоды лізінгавай кампаніі», — адзначыў спецыяліст.

Тут Аляксандр Дзядкоў звярнуў увагу, што распрацоўшчыкі ўказа №109 пастараліся прапісаць усе магчымыя сітуацыі, каб абараніць лізінгаатрымальніка, які з-за цяжкіх жыццёвых акалічнасцяў не можа часова выконваць свае абавязацельствы па дагаворы. «Калі добрасумленны раней кліент з-за праблем у жыцці не можа выконваць свае абавязацельствы, то прадугледжаны ахоўны механізм. Калі ён да трох разоў не выконвае дагавор лізінгу, гэта не можа быць падставай для скасавання дагавора. Калі больш за тры разы — тады сітуацыя вырашаецца па згодзе бакоў», — паведаміў ён.

Засталося некалькі слоў пра чаргу і мэтавае выкарыстанне жылля. Ва ўказе прапісваецца, што за грамадзянінам, які заключыў дагавор лізінгу жылога памяшкання, захоўваецца права заставацца на ўліку па паляпшэнні жыллёвых умоў да пераходу да яго права ўласнасці на гэта жылое памяшканне. А жылы дом або кватэра, атрыманыя ў часовае валоданне і карыстанне па дагаворы лізінгу, не могуць выкарыстоўвацца для прадпрымальніцкай дзейнасці. Нормы агучанага ўказа №109 пачнуць дзейнічаць праз 6 месяцаў пасля яго падпісання.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

ПАМЯЦЬ ПРА «ЗВЯЗДОЎЦА»

Уладзіміра Марука добра ведае айчынны чытач, хоць і друкаваўся ён няшмат. Мо таму і памятаюць, што кожны яго вершаваны радок выверан і, як бы гэта патэтычна ні гучала, выпакутаваны.



Гэта датычыцца яго кніг «Зоркі ў кронах», «Ліст рабіне», «Інкрустацыя голасам». Ураджэнец палескай вёскі Гута, ён пражыў не такі і доўгі век. Нарадзіўся ў 1954 годзе, 6 студзеня, а не стала Уладзіміра Антонавіча 23 студзеня 2010 года. Дакладней — ён застаўся з намі. Вершамі, памяццю пра работу ў «Звяздзе», дзе працаваў карэспандэнтам, загадчыкам аддзела літаратуры і мастацтва. Для газеты шмат што напісаў у публіцыстычным фармаце, шмат падрыхтаваў чужых матэрыялаў, у якіх таксама імкнуўся давесці да пэўных вышынь красу і фарбы роднага слова.

І кніга «Яршы плялі кашы», якую толькі што выпусцілі ў «Мастацкай літаратуры» — сведчанне яшчэ і яго таленту як дзіцячага пісьменніка. Уладзімір Марук стараўся размаўляць з юным чытачом ясна, зразумела, лаканічна. Кніга кароткіх вершаў уражвае, захапляе, просіцца для чытання дзецьмі і іх бацькамі.

А выдалі ў «Мастацкай» яе адмыслова, выкарыстаўшы для афармлення малюнкі Анастасіі Сакалоўскай і навучэнцаў студыі «АртДэпо». Назавём усіх рупліўцаў, магчыма, у будучым добрых кніжных графікаў — Дар'я Сікорская, Ганна Вайшэвіч, Ілья Шульган, Ганна Стаселька, Стася Белавусава, Паліна Савінава, Лера Чатырко, Віка Чатырко, Ксенія Пахолкава, Федзя Храпко, Соня Піваварава. Дзякуй юным талентам! І дзякуй выдавецтву «Мастацкая літаратура», што ў стагадовы юбілей «Звязды» з'явілася добрая кніга добрага журналіста і добрага паэта, а яшчэ — добрага і шчырага, светлага чалавека Уладзіміра Марука.

Дарэчы, адзін з першых надрукаваных вершаў Уладзіміра Антонавіча — «Беларусі». І надрукаваны ён быў у «Магілёўскай праўдзе», калі будучы «звяздовец» яшчэ вучыўся ў бібліятэчным тэхнікуме.

Сяргей ШЫЧКО.

ОАО «НАФТАН» УНП 300042199

реализует на конкурсной основе (с повышением начальной цены) бывшее в употреблении неиспользуемое имущество:

Пометка на конверте	Наименование	Год выпуска	Начальная цена с НДС, руб. РБ
Реализация неликвидов, танк-контейнера, 11.05.2017	Танк-контейнер двадцатифутовый наливной – 10 штук (инв. №166926, 166893, 166898, 166900, 166931, 166899, 166945, 166932, 166939, 166946)	1987	5 520,00
Реализация неликвидов, 11.05.2017	Мини-трактор МТЗ 112 в комплекте с навесным оборудованием (прицеп, косилка, окучник, почвофреза, плуг, борона, культиватор) (инв. №04150226)	2002	3 764,00

Состояние удовлетворительное.
Предложения принимаются по адресу: 211441, г. Новополоцк-1, ОАО «Нафтан», заводоуправление, каб. 101, до 9.30 по местному времени 11 мая 2017 года с пометками на конверте, указанными в таблице.

Извещение на проведение конкурса размещено на сайте www.naftan.by.

Контактные телефоны:
8(0214) 59-87-83, 8(0214) 59-89-26, 8(0214) 59-88-42, 8(0214) 59-88-01, (033) 398 07 67.

...ГНУТКАСЦЬ, МАБІЛЬНАСЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Ад нашай краіны ў праекце прымаюць удзел Белдзяржуніверсітэт, БДЭУ, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт, Гродзенскі дзяржаўны аграрны ўніверсітэт, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны, Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы.

Мэта праекта FOSTERC — рэалізацыя кампетэнтнаснага падыходу ў вышэйшай адукацыі і паглыбленне сувязяў з арганізацыямі — заказчыкамі кадраў. Нядаўна ў Мінску прайшоў міжнародны семінар, на якім якраз і абмяркоўваліся гэтыя праблемы.

Усе эксперты пагаджаюцца, што адукацыя, арыентаваная толькі на атрыманне ведаў, — учарашні дзень. У свеце, які імкліва змяняецца, сістэма адукацыі павінна фарміраваць такія новыя якасці ў выпускніка, як ініцыятыўнасць, інавацыйнасць, мабільнасць, гнуткасць, дынамізм і канструктыўнасць. Будучы прафесіянал павінен імкнуцца да самаадукацыі на працягу ўсяго жыцця, валодаць новымі тэхналогіямі і разумець магчымасці іх выкарыстання, умець прымаць самастойныя рашэнні, хутка адаптавацца ў сацыяльнай і прафесійнай сферы, працаваць у камандзе, быць гатовым да перагрузак, стрэсавых сітуацый і ўмець хутка з іх выходзіць. Натуральна, што выхаванне такой сацыяльна і прафесійна актыўнай асобы патрабуе ад педагогаў вышэйшай школы прымянення цалкам новых метадаў, прыёмаў і формаў работы. Каб сфарміраваць кампетэнтнага ва ўсіх патэнцыйна значных сферах прафесійнай адукацыі выпускніка, трэба выкарыстоўваць актыўныя метады навучання, тэхналогіі, якія развіваюць перш за ўсё пазнавальную, камунікатыўную і асобасную актыўнасць цяперашніх студэнтаў.

Адукацыя з арыентацыяй на рынак

Кампетэнтнасны падыход да навучання студэнтаў змяняе сучасныя адукацыйныя мэты. Вышэйшая адукацыя на постсавецкай прасторы традыцыйна грунтавалася на фундаментальнасці ведаў і падрыхтоўцы спецыялістаў шырокага профілю, што калісьці лічылася яе перавагай. Але сёння рынак усё больш актыўна патрабуе практыка-арыентаваныя кадры.

З 2013 года ў беларускай вышэйшай школе дзейнічаюць адукацыйныя стандарты трэцяга пакалення, але ўжо сёння вядзецца работа над наступным пакаленнем стандартаў 3+.

— Новыя стандарты будуць уведзены ў прававое поле разам з новым Кодэксам аб адукацыі, — тлумачыць **прарэктар па навукова-метадычнай рабоце Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы Ігар ЦІТОВІЧ**. — Зыходзячы з расійскага і еўрапейскага досведу, можна сцвярджаць, што кампетэнтнасны падыход у адукацыі будзе рэалізаваны ў поўнай меры толькі пры цеснай узаемасувязі ўстаноў адукацыі з заказчыкамі кадраў, у тым ліку і з прадстаўнікамі бізнес-супольнасці. Менавіта работадаўцы павінны фармуляваць тыя кампетэнцыі, якія патрабуюцца спецыялістам заўтрашняга дня, з прыцэлам на будучыню, а не быць праста пасіўнымі спажыўцамі вынікаў працы вышэйшай школы. Для прафесійнай экспертызы адукацыйных стандартаў быў створаны спецыяльны партал http://edustandart.by, дзе размяшчаюцца стандарты пакалення 3+ для бакалаўрыяту і магістратуры. І ўсе зацікаўленыя, у тым ліку і работадаўцы, могуць пакінуць там свае прапановы, пажаданні і думкі. Шчыра кажучы, нам бы хацелася больш актыўнага дыялогу з імі.

Адукацыйныя стандарты ўстанаўліваюць патрабаванні да зместу прафесійнай дзейнасці спецыяліста з вышэйшай адукацыяй, зместу адукацыйных праграм, формаў і тэрмінаў атрымання вышэйшай адукацыі, арганізацыі адукацыйнага працэсу, максімальнага аб'ёму вучэбнай нагрузкі на студэнтаў, узроўню падрыхтоўкі выпускнікоў і выніковай атэстацыі. Пры распрацоўцы адукацыйных стандартаў 3+ ставіцца таксама задача сфармуляваць кампетэнцыі для бакалаўраў і магістраў: універсальныя — для ўсіх, базавыя прафесійныя — для бакалаўраў, паглыбленыя прафесійныя — для магістраў і спецыялізаваныя. Спецыялізаваныя кампетэнцыі будуць вызначацца ўстановамі вышэйшай адукацыі з улікам патрабаванняў рынка працы, кансультацый з аб'яднаннямі работадаўцаў, з улікам замежнага досведу і прыцягнення іншых крыніц. Галоўная задача адукацыйных стандартаў 3+ — забяспечыць сувязь з рынкам працы і аператыўна рэагаваць на яго запыты.

Кодэкс і новыя падыходы

Па словах **начальніка ўпраўлення вышэйшай школы Міністэрства адукацыі Сяргея КАСПЯРОВІЧА**, асноўныя прынцыпы Балонскага працэсу і «дарожнай карты» знайшлі адлюстраванне ў праекце Кодэкса аб адукацыі. У прыватнасці, у новай яго рэдакцыі будзе замацавана шматступеньчатасць вышэйшай школы, а таксама магчымасць для арганізацыі новых формаў адукацыйнага працэсу, такіх як дыстанцыйнае навучанне (зараз яно існуе толькі як адна з формаў завочнага навучання, а не як самастойная форма) і сеткавае ўзаемадзеянне. У прыватнасці, сеткавае ўзаемадзеянне дазволіць розным установам адукацыі і іншым арганізацыям ажыццяўляць сумесную падрыхтоўку спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй як у рамках двайных дыпломаў, так і ў рамках адукацыйных кластараў, прадстаўленых рознымі арганізацыямі. Акрамя таго, прадугледжваецца істотнае пашырэнне акадэмічнай аўтаномнасці ВНУ за кошт пераходу ад тыпавой вучэбна-праграмнай дакументацыі да прыкладной.

— Увогуле ў кодэксе закладваецца модульны падыход да зместу адукацыйных праграм (аб'яднанне дысцыплін у модулі. — **Аўт**.). Будзе замацавана сістэма заліковых адзінак, якая дазволіць у будучыні больш эфектыўна рэалізоўваць інтэграваныя праграмы і сеткавую падрыхтоўку, прычым не толькі ў рамках Беларусі, але і з замежнымі партнёрамі, што павысіць мабільнасць студэнтаў. Будзе пашырана практыка выбару студэнтам вучэбных дысцыплін. Частка паўнамоцтваў, звязаных з фарміраваннем адукацыйных праграм, перадаецца на ўзровень універсітэтаў, — звяртае ўвагу Ігар Цітовіч.

Абавязковы кампанент, зафіксаваны на ўзроўні адукацыйнага стандарту, будзе складаць у адукацыйных праграмах бакалаўрыята да 50 працэнтаў. Астатнія 50 працэнтаў зместу будуць фарміраваць непасрэдна ВНУ з улікам тых задач, якія яны вырашаюць ва ўзаемадзеянні з заказчыкамі кадраў. А ў магістарскіх адукацыйных праграмах на ўзроўні стандарту будзе фіксавацца і ўвогуле толькі 30 працэнтаў іх напаўнення, а 70% — аддаецца ВНУ.

Не сакрэт, што сёння ў навучальным працэсе ў вышэйшай школе дамінуе лекцыйная форма заняткаў, што зусім не спрыяе фарміраванню ў студэнтаў прафесійных кампетэнцый. Навучанне павінна быць больш практыка-арыентаваным, гэта канстатуюць усе спецыялісты. Да таго ж пры атэстацыі студэнтаў пакуль што пераважае праверка акадэмічных ведаў, а не дыягностыка сфарміраваных кампетэнцый. Сур'ёзнай праблемай застаецца і нявысокая значнасць статуса магістра на рынку працы. Бакалаўрыят фактычна зойме месца цяперашняй I ступені вышэйшай школы, добра зразумелай наймальнікам. Таму пазнавальнасць дыпломаў бакалаўраў у будучыні забяспечана, чаго не скажаш пра дыпломы магістраў...

Цяпер у беларускіх ВНУ — занадта шырокі спектр спецыяльнасцяў і спецыялізацый: на першай ступені — каля 400 і больш як тысяча спецыялізацый і больш як 300 спецыяльнасцяў прапануюць у магістратуры. Натуральна, што прафесійна-кваліфікацыйная структура вышэйшай адукацыі павінна быць аптымізаваная. Таму актыўна вядзецца работа над новым Класіфікатарам спецыяльнасцяў і кваліфікацый і адначасова — над стварэннем Нацыянальнай сістэмы кваліфікацый.

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

Фота Надзеі БУЖАН.

■ Прававая гасцёўня

МАЁМАСЦЬ У СПАДЧЫНУ ЦІ ПАДАРУНАК

Падоранае цяжка вярнуць, а свабода завяшчання — абмежаваная

— Я жыву ў трохпакаёвай кватэры разам з унучкай. Маю дарослых сына і дачку, якая жыве ў іншым горадзе. У свой час мы значна дапамаглі сыну пры будаванні кватэры, падарылі яму садовы ўчастак і дом непадалёк ад горада. Хачу, каб трохпакаёўка дасталася ўнучцы. Падкажыце, як гэта лепш зрабіць, каб не ўзнікла ніякіх юрыдычных момантаў, якія можна было б трактаваць па-рознаму? Лепш падарыць кватэру ўнучцы ці завяшчаць? Чым гэтыя два дзеянні адрозніваюцца адно ад аднаго?

Агрыпіна Васілеўна,
г. Верхнядзвінск, Віцебская вобл.

На пытанні адказвае Вольга КОЗЕЛ, кансультант упраўлення натарыята і загсаў Міністэрства юстыцыі Беларусі:

— Каб зрабіць правільны выбар, трэба ўсведамляць сутнасць і адрозненні дагавораў дарэння і завяшчання, кожны з якіх мае свае асаблівасці. Калі вы гатовы перастаць быць уласнікам кватэры і хочаце, каб гэтая маёмасць належала ўнучцы да дня вашай смерці, можна заключыць дагавор дарэння. Калі ж да дня смерці вы хочаце заставацца ўласнікам сваёй нерухомасці, лепш скласці завяшчанне. Пры гэтым неабходна памятаць пра правы спадчыннікаў на абавязковую долю ў спадчыне.

Дарыць так, каб не пашкадаваць

Дарэнне — гэта як мінімум двухбаковая здзелка. З аднаго боку — дарыльшчык з намерам падарыць, з другога — атрымальнік, які хоча прыняць падарунак. Да перадачы маёмасці атрымальнік мае права ў любы час адмовіцца ад нерухомасці, якую яму намерваюцца падарыць.

Дагавор дарэння і заснаваныя на ім правы (у тым ліку права ўласнасці атрымальніка дарэння на жылое памяшканне) падлягаюць дзяржаўнай рэгістрацыі, пасля якой уласнікам маёмасці становіцца атрымальнік дарэння. Ён можа валодаць, карыстацца і распараджацца набытай нерухомасцю паводле свайго меркавання. Пры гэтым дарыльшчык і члены яго сям'і могуць толькі захаваць за сабой права валодання і карыстання, што трэба зазначыць у дагаворы.

Здараецца, што для дарэння неабходна згода пэўных асоб. Напрыклад, мужа ці жонкі (калі маёмасць знаходзіцца ў сумеснай уласнасці сужэнцаў), удзельнікаў прыватызацыі, асоб, якія пражываюць у жылым памяшканні па завяшчальным адпісанні.

Здараецца і так, што дарыльшчык шкадуе аб здзейсненым. Бывае, моцна пагаршаюцца адносіны з другім бокам дагавора, мяняецца матэрыяльнае або сямейнае становішча дарыльшчыка ці нават проста атрымальнік дарэння не клапоціцца пра падораную маёмасць так, як гэтага хацеў бы дарыльшчык. Пералічаныя выпадкі (і не толькі гэтыя), на жаль, не з'яўляюцца прычынай для скасавання дагавора дарэння.

Артыкулам 549 Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь прадугледжаны наступныя падставы для адмены дарэння:

• атрымальнік дарэння здзейсніў замах на жыццё дарыльшчыка, кагосьці з членаў яго сям'і ці блізкіх сваякоў або наўмысна прычыніў дарыльшчыку цялесныя пашкоджанні;

• атрымальнік дарэння наўмысна пазбавіў дарыльшчыка жыцця (у дадзеным выпадку права адмены дарэння належыць спадчыннікам дарыльшчыка);

• здзяйсненне індывідуальным прадпрымальнікам ці юрыдычнай асобай з парушэннем палажэнняў акта заканадаўства аб эканамічным банкруцтве за кошт сродкаў, звязаных з яго прадпрымальніцкай дзейнасцю, на працягу шасці месяцаў, якія папярэднічалі аб'яўленню такой асобы банкрутам.

Акрамя таго, дарэнне можа быць адменена, калі дарыльшчык перажыве атрымальніка дарэння, але гэта павінна быць агаворана непасрэдна ў дагаворы дарэння.

Завяшчаць асабіста і з умовамі

Завяшчаннем прызнаецца волевыяўленне грамадзяніна аб распараджэнні маёмасцю, якая яму належыць, на выпадак яго смерці. Пакуль чалавек жывы, ён з'яўляецца ўласнікам маёмасці і, нягледзячы на наяўнасць завяшчання, можа распараджацца ёю па сваім разуменні. Спадчыннікі набываюць права на гэтую маёмасць толькі пасля яго смерці.

Каб завяшчанне было прызнана сапраўдным, яно павінна быць складзена пісьмова і натарыяльна засведчана, інакш дакумент будзе лічыцца несапраўдным.

Скласці завяшчанне могуць толькі поўнасцю дзеяздольныя грамадзяне. Дзеці і недзеяздольныя не маюць права ствараць такі дакумент.

Завяшчанне мае строга асабісты характар і не можа складацца праз прадстаўніка.

Адпаведна беларускаму заканадаўству завяшчанне можа змяшчаць распараджэнні толькі адной асобы. Здзяйсненне аднаго завяшчання ад імя дзвюх ці большай колькасці асоб недапушчальна. Напрыклад, муж і жонка не могуць вызначыць лёс сумесна набытай падчас шлюбу кватэры ў сумесным завяшчанні. Кожнаму з сужэнцаў неабходна скласці ўласнае завяшчанне, дзе будуць змяшчацца распараджэнні адносна сваёй долі ў агульнай маёмасці.

Згодна з прынцыпам свабоды завяшчання завяшчальнік мае права:

• завяшчаць усю сваю маёмасць ці яе частку адной або некалькім асобам, якія як уваходзяць, так і не ўваходзяць у кола нашчадкаў па законе;

• пакінуць спадчыну Рэспублікі Беларусь і яе адміністрацыйна-тэрытарыяльным адзінкам;

• без тлумачэння прычын пазбавіць спадчыны аднаго, некалькіх або ўсіх наследнікаў па законе;

• распарадзіцца ў завяшчанні любой маёмасцю, у тым ліку той, уласнікам якой завяшчальнік можа стаць на дзень адкрыцця спадчыны;

• абумовіць атрыманне спадчыны пэўнай правамернай умовай адносна характару паводзін наследніка (напрыклад, абавязаць чалавека, якому адыходзіць кватэра, забяспечыць іншай асобе пажыццёвае карыстанне дадзеным жыллём або ўтрымліваць жывёл, якія належалі спадчынадаўцу).

Эксперт міністэрства энергетыкі і эканомікі Германіі Клаус ЯКАБІ дадаў, што сваю «зялёную» энергетыку немцы стварылі самі. Для гэтага дастаткова арганізаваць фонд, у які паступяць сродкі ад насельніцтва, падрыхтаваць адпаведную дакументацыю і ажыццявіць праект. Ініцыятыва людзей — галоўны козыр «зялёных» праектаў, людзі ўкладаюць грошы ў чыстую энергетыку, у сваю будучыню.

Сёння Еўропа цвёрдымі крокамі ідзе па шляху адмовы ад выкапнёвага паліва («энергетычны паварот») да «зялёнай» энергіі. А ў Беларусі ёсць не толькі наглядны прыклад, але і патэнцыйны партнёр у пытаннях чыстай энергетыкі.

Вольга ПРАЛЮК.
pralyuk@zviazda.by

А як у іх...

Урад зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія (Германія) мае намер перарабіць каменнавугальную шахту Праспэр-Ханіэль у 200-мегаватную гідраакумулюючую станцыю. Такая «батарэя» зможа забяспечыць электраэнергіяй каля 400 000 дамоў.

Падобнае выкарыстанне шахтаў дапаможа палепшыць эканоміку малых гарадоў, забяспечыць рэгіёны новымі працоўнымі месцамі. Гідраакумулюючая станцыя здольная даваць электраэнергію пры адсутнасці ветру і сонечнага святла.

Мясцовыя ўлады запланавалі да 2025 года давесці долю аднаўляльнай энергіі ў балансе зямлі да 30%, таму будуць перабудаваныя і іншыя шахты.

Стабільна нізкія цэны на аптовым рынку электрычнай энергіі паскараюць закрыццё старых электрастанцый Германіі, якія належаць камунальным прадпрыемствам. Ужо зроблены заяўкі на закрыццё 27 старых вугальных і газавых электрастанцый (6,6 ГВт), якія забяспечвалі энергіяй 13 млн дамоў.

■ Добрая справа

21 МІЛЬЁН НОВЫХ ДРЭЎ

«Тыдзень лесу — 2017» сабраў рэкордную колькасць удзельнікаў

Акцыя «Тыдзень лесу — 2017» завяршылася 8 красавіка, у ёй прынялі ўдзел 82,5 тысячы чалавек. У Міністэрстве лясной гаспадаркі Беларусі расказалі, што ўпершыню пачалі высаджваць лес талакой у 1924 годзе. Аднак з часам гэтая практыка спынілася. У 2007 годзе Мінлясгас ініцыяваў правядзенне акцыі «Тыдзень лесу», і яна стала ўжо добрай традыцыяй.

Для добраахвотных памочнікаў — удзельнікаў акцыі «Тыдзень лесу — 2017» работнікі лясгасаў падрыхтавалі больш за 800 участкаў па ўсёй краіне, але асабліва чакалі валанцёраў там, дзе трэба было аднаўляць пасадкі пасля разгулу ўрагану, які летась знішчыў больш за 15 тысяч гектараў лесу.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

У гэтым годзе на запрашэнне Мінлясгаса адгукнулася найбольшая колькасць удзельнікаў. Работнікі міністэрстваў і ведамстваў, дэпутаты, школьнікі, студэнты, рабочыя, пенсіянеры, вайскоўцы, прадстаўнікі прыватнага бізнесу — усе яны зарабілі працоўны ўнёсак у справу аднаўлення лясоў.

Нашай краіне дапамагаюць і міжнародныя структуры. У прыватнасці, Сусветны банк і Міністэрства лясной гаспадаркі Беларусі рэалізуюць ужо другі сумесны праект. Паводле слоў кіраўніка прадстаўніцтва Сусветнага банка ў Беларусі Яна Чул Кіма, які, дарэчы, асабіста браў удзел у акцыі «Тыдзень лесу — 2017» у Смалявіцкім раёне, дзеючы сумесны праект ацэньваецца ў 40,7 млн долараў і накіраваны на мадэрнізацыю ляснога сектара.

«За гэты тыдзень створаны лясныя культуры на плошчы 6 700 га. З іх 1 100 га — участкі лесу, пашкоджаныя ўраганамі, — падзялілася вынікамі акцыі прэс-сакратар Міністэрства лясной гаспадаркі Беларусі Дар'я Ляпешка. — Высаджана амаль 21 млн дрэў, праведзена частковая пасадка лясных культур на плошчы 1 834 га. Адрамантавана таксама 138 месцаў адпачынку, прыбрана больш за тысячу кубаметраў смецця з тэрыторыі ляснога фонду, прыдарожных палос, месцаў адпачынку».

У рамках акцыі «Тыдзень лесу — 2017» валанцёры займаліся таксама добраўпарадкаваннем прысядзібных тэрыторый, прывядзеннем у належны стан воінскіх пахаванняў, якія знаходзяцца на тэрыторыі ляснога фонду, абнаўленнем дэндрапаркаў лясгасаў і лясніцтваў.

Аксана ЯНОЎСКАЯ. *yanovskaya@zviazda.by*

■ Ёсць праблема

ЖЫВАЯ ПАМЯЦЬ — ЖЫВЫЯ КВЕТКІ

А штучным на могілках не месца

Напярэдадні Радаўніцы прадстаўнікі Цэнтра экалагічных рашэнняў выказалі сваю занепакоенасць праблемай масавага выкарыстання штучных кветак на могілках.

— Нягледзячы на сваю прывабнасць і прастату выкарыстання штучныя кветкі ўяўляюць сабой сур'ёзную небяспеку для навакольнага асяроддзя і здароўя чалавека, — тлумачыць пазіцыю эколагаў **кіраўнік праграмы па экалагічна дружалюбным ладзе жыцця Дар'я ЧУМАКОВА.** — Як правіла, кветкі вырабляюць са штучных матэрыялаў. Пялёсткі — з сінтэтычных тканін, напрыклад, з паліэстару, латэксу, арганзы, апрацаваных рознымі хімічнымі саставамі для надання ім пластычнасці і трываласці. Для афарбоўвання часцей за ўсё выкарыстоўваюцца аніліновыя фарбы, якія ўяўляюць сабой досыць таксічныя злучэнні, што могуць аказваць негатыўнае ўздзеянне на здароўе, выклікаючы галавакружэнне, галаўны боль, слабасць.

Сцябло, бутоны і іншыя дэкаратыўныя элементы штучных кветак у большасці выпадкаў вырабляюцца з пластыку, часцей за ўсё ПВХ, які таксама даволі таксічны.

Асяродак кветак і дробны дэкор можа вырабляцца з афарбаванага ці неафарбаванага пенапласту. Пенапласт пры награванні (напрыклад, на сонцы) можа вылучаць канцэрагеннае рэчыва — стырол.

Штучныя кветкі, гэтак жа як і іншыя штучныя пахавальныя ўпрыгажэнні, рана ці позна аказваюцца на сметніку. Выкінутыя штучныя кветкі могуць працягваць вылучаць таксічныя рэчывы, забруджваючы глебу, паветра і грунтавыя воды. А пры іх спальванні ў навакольнае асяроддзе могуць выдзяляцца цяжкія металы і дыяксіны.

Эколагі папярэджваюць: перапрацоўцы штучныя кветкі не паддаюцца, паколькі складана ўстанавіць тып пластыку для адпаведнага сартавання адходаў. Да таго ж яны ўтрымліваюць шмат пабочных матэрыялаў, якія цяжка раздзяліць. Такім чынам, што б мы ні рабілі са штучнымі кветкамі, пазбавіцца ад іх, не нашкодзіўшы прыродзе і чалавеку, не атрымаецца. Такім чынам, купляючы штучныя кветкі, мы ўкладваем свае грошы ў смецце...

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Па статыстыцы за 2015 год у Беларусі на Радаўніцу могілкі наведала каля 1,5 мільёна чалавек. Нават калі траціна з усіх, хто наведае могілкі, прынясе з сабой хоць бы дзве штучныя кветкі, то на магілах нашых памерлых акажацца каля аднаго мільёна штучных кветак! А гэта прыблізна 10 тон пластыку!

Да таго ж традыцыя штучных кветак не мае глыбокіх гістарычных каранёў і налічвае не больш як 10—15 гадоў. Прынята лічыць, што штучныя кветкі каштуюць танней за сапраўдныя і даўжэй захоўваюць сваю знешнюю «свежасць». Часткова — гэта міф. На адкрытай прасторы і сонцы яны даволі хутка страчваюць свой таварны выгляд. Лепш пасадзіць побач з магілай жывыя кветкі, якія будуць доўга яе ўпрыгожваць.

«Ёсць і яшчэ адна важная акалічнасць, — падкрэслівае Дар'я Чумакова. — Кідкія штучныя кветкі зусім не адпавядаюць атмасферы могілак у яе хрысціянскім разуменні. Гэта не пляцоўка для дэманстрацыі яркіх «кіслотных» фарбаў і безгустоўных штучных упрыгожванняў, а месца, дзе жывыя могуць у цішыні ўспомніць у малітве памерлых і, не адцягваючы сваю ўвагу, пабыць разам з імі».

Надзея НІКАЛАЕВА.
nikalaeva@zviazda.by

ЗА МАІМ ПЛОТАМ — ХОЦЬ ТРАВА НЕ РАСЦІ?

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

— Па дарозе з Мінска ў Мар'іну Горку ўбачыла білборд: яркія вясёлыя мяшкі са смеццем просяць давезці іх да кантэйнера. Як часта іх не давозяць?

— У выхадныя і асабліва, калі яны даўжэйшыя за кошт свят, безумоўна, павялічваецца нагрузка на кантэйнерныя пляцоўкі. Многія дачнікі ў лепшым выпадку выкідваюць смецце на прыпынках прыгараднага транспарту — там яно хоць бы спакаванае. У мінулым годзе, дзякуючы фотапасткам, мы прыцягнулі да адміністрацыйнай адказнасці ўсяго толькі трох грамадзян за тое, што яны выкінулі смецце ў забароненым месцы. Парушальнікаў значна больш, аднак іх цяжка ідэнтыфікаваць — фактычна толькі па нумарах аўтамабіляў.

Яшчэ да пачатку сёлетняга дачнага сезона мы правялі сход старшынь садовых таварыстваў, абмеркавалі ўсе надзённыя пытанні, нагадалі пра адказнасць за адміністрацыйныя правапарушэнні ў частцы прыродакарыстання.

— Ці забяспечаны садовыя таварыствы кантэйнерамі для збору смецця ў дастатковай колькасці?

— Наш раён — адзін з першых у вобласці, дзе ў сельскай мясцовасці былі ўстаноўлены кантэйнеры для паасобнага збору смецця, гэта дазволіла закрыць міні-палігоны. Цяпер у раёне ўстаноўлены 2362 кантэйнеры — у райцэнтры, вёсках, гаражных кааператывах і садовых таварыствах. Як імі карыстаюцца, шмат у чым залежыць нават не ад экалагічнай, а ад агульнай культуры людзей. Шлях смецця да урны праходзіць праз нашу свядомасць. І вось яе змяніць цяжэй за ўсё. Але мы працуем і разумеем, што людзям цяжка адмовіцца ад звычак, якія складваліся дзесяцігоддзямі, тым не менш пэўныя вынікі ёсць.

— Старшыня нашага садовага таварыства заўсёды нагадвае, каб скошвалі траву на ўчастках, не захламлялі агульную тэрыторыю, а сарціроўцы смецця быў прысвечаны асобны сход. Пры гэтым старшыня ўсіх нас палохае «экалагічнай інспекцыяй».

— Мы сапраўды ўдзяляем вялікую ўвагу тэрыторыям садовых таварыстваў. Па статуце, СТ абавязана даглядаць у тым ліку плошчу ў 50 метраў за агароджай таварыства. Мы глядзім, ці няма сметнікаў у зоне адказнасці СТ, а калі яны ёсць, то складаем пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні. Штрафныя санкцыі, якія накладаюцца на юрыдычную асобу, а садовае таварыства такой і з'яўляецца, даволі адчувальныя. Напрыклад, адно з садовых таварыстваў раёна было аштрафавана на суму 1470 дэнамінаваных рублёў. Пакаранне рублём, а менавіта, калі памер штрафу ад 50 да 100 базавых велічынь, дае добры выхаваўчы эфект — людзі пачынаюць думаць: выкінуць смецце за плот ці ўсё ж такі данесці яго да кантэйнера.

У Пухавіцкім раёне 167 садовых таварыстваў, у іх размяшчаецца 22 тысячы ўчасткаў. У дачны сезон, асабліва ў выхадныя дні, насельніцтва раёна павялічваецца прыкладна на 50 тысяч чалавек, што крыху менш за колькасць пастаянных жыхароў рэгіёна.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Што датычыцца скошвання травы, то ў садовых таварыствах, як і на тэрыторыях сельскагаспадарчых кааператываў, сур'ёзную праблему ствараюць шкодныя расліны. Як толькі зямлю перастаюць апрацоўваць, дык адразу на палях распаўсюджваецца сумнік канадскі. Гэта вельмі небяспечнае пустазелле, яго насенне разносіцца ветрам на вялікую адлегласць. Калі сумнік трапіў на поле, праз 3—4 гады там нічога, акрамя яго, расці не будзе. Мы ведаем, як змагацца з баршчэўнікам — вядомыя месцы яго дыслакацыі, пустазелле скошваецца, не паспеўшы падрасці. З сумнікам справа ідзе горш: людзі ўспрымаюць яго як дзікарослую кветку, а не пустазелле. У гэтым годзе мы плануем усталяваць два білборды з тлумачэннямі пра шкоду сумніку.

— Але ж на дачах і акрамя смецця хапае праблем з пункту гледжання экалагічнай бяспекі?

— Так, вось у мінулым годзе з'явілася новая праблема. Пасля ўраганаў дачнікі раптам вырашылі самавольна спілаваць дрэвы, маўляў, наступны ўраган іх паваліць, і яны ўпадуць на дом. Замест таго, каб застрахаваць дом ад стыхійных бедстваў, людзі хочуць знішчыць жывое дрэва. За самавольнае спілоўванне дрэў таксама прадугледжана адміністрацыйная адказнасць, і два таварыствы былі пакараныя. Кіраўніцтва яшчэ некалькіх СТ звярталася па дазвол спілаваць дрэвы, але такі дакумент яны не атрымалі, таму што дрэвы былі абсалютна здаровыя. Нас вельмі натхніла патрабаванне Прэзідэнта аб спыненні практыкі знішчэння дрэў уздоўж ліній электрапередачы і лесаахоўных палос уздоўж дарог. Лесаахоўныя палосы ў свой час прыдумалі дасведчаныя людзі. Высаджаныя ўздоўж дарог дрэвы абараняюць глебу ад шкодных аўтамабільных выкідаў, а падчас буйства стыхіі, як напрыклад, цыклон Хаўер — ад гурбаў на дарозе.

— На тэрыторыі раёна пяць заказнікаў рэспубліканскага значэння і чатыры — мясцовага. Напэўна, дачнікі таксама праяўляюць цікавасць да гэтых тэрыторый?

— Асаблівых праблем тут як раз няма, усё ж такі заказнікі — гэта асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі. Зрэшты, і дачнікі, і мясцовыя жыхары нярэдка выходзяць збіраць журавіны раней дазволенага тэрміну. Што характэрна, для сябе збіраюць журавіны, калі яны паспелі, а на продаж бяруць яшчэ белыя ягады, якія потым дзесьці на падворках даспяваюць у мяшках. Пажыўная карысць такіх ягад імкнецца да нуля, але людзі, якія купляюць журавіны на рынках, прыдарожных базарах, нават не здагадваюцца пра гэта. Таму мая парада: хочаце добрыя ягады, — збірайце самі ва ўстаноўленыя тэрміны.

На жаль, прыцягнуць да адказнасці асоб, якія парушаюць тэрміны збору журавін і іншых дароў лесу, складана. Патрэбна важкая доказная база. Калі чалавек знаходзіцца на тэрыторыі балота за два тыдні да пачатку сезона збору ягад, фармальна ён нічога не парушае, а вось калі ў яго за плячыма мех з ягадамі, тады ёсць падстава для разбіральніцтва.

— Думаю, у кожным садовым таварыстве ёсць некалькі чалавек, якія ўвесь час пішуць у розныя інстанцыі скаргі на суседзяў. Ці паступаюць да вас такія звароты?

— У год мы атрымліваем прыкладна 30 зваротаў грамадзян. Па кожным праводзіцца праверка. Часцей за ўсё скаргі пішуць дачнікі, а па выніках праверкі парушэнне выяўляецца не толькі ў таго, на каго скардзіліся, але і ў самога заяўніка. Каля 1/3 скаргаў наогул не абгрунтаваныя, тым не менш праверку гэта не адмяняе. На яе сыходзіць працоўны час спецыялістаў, які яны маглі б выкарыстоўваць значна больш эфектыўна.

Аксана ЯНОЎСКАЯ.
yanovskaya@zviazda.by

Як змагацца з сумнікам канадскім

На працягу некалькіх гадоў у маі і жніўні рэкамендуецца скошваць сумнік або перакопваць глебу ў летні час у сухое надвор'е.

Прымяненне гербіцыдаў, у тым ліку і гліфасат-змяшчальных, эфектыўна пры вышыні раслін 10—15 см, пазней адчувальнасць сумніку да іх значна зніжаецца.

■ У свеце жывёл

СУМНЫ «РЫБНЫ ДЗЕНЬ»

Ці можа атрымаць возера «другое дыханне»?

Пра масавую гібель рыбы ў возеры Карасёва, што ў Сенненскім раёне, паведаміў чытач. Расказаў пра тое, што турбуе неабыякавых тутэйшых і прыезджых рыбакоў. Яны цікавяцца, у чым сапраўдная прычына мору рыбы ў вадаёме? Паводле слоў суразмоўцы, надзвычайная экалагічная сітуацыя паўтараецца штогод.

Ходзяць чуткі, што...

Побач няма ачышчальных збудаванняў, прадпрыемстваў, фермаў. Такім чынам, напэўна, версію наконт атручвання бруднымі водамі можна не разглядаць.

У СМІ, паводле разважанняў заяўніка, сёлета была распаўсюджаная супярэчлівая інфармацыя. У прыватнасці, дасталася і лясгасу, які адказвае за возера. Маўляў, чаму не зрабілі лункі, каб рыба магла дыхаць, калі вада пакрываецца лёдам? У выніку штогод назіраецца вялікая колькасць мёртвай рыбы. І ўжо на падыходзе да берага адчуваецца непрыемны пах.

Вінавацілі ў інтэрнэце і работнікаў экалагічнай інспекцыі. Ім, на думку «апанентаў», быццам бы ўсё роўна, што з рыбай, а галоўнае — «выканаць план па «лоўлі» браканьераў»...

Пры гэтым насамрэч ёсць нямала прыкладаў, калі рыбу ловяць з выкарыстаннем забароненых рыбацкіх сродкаў. Дарэчы, у якасці апраўданняў парушальнікі спасылаюцца на маленькую зарплату. Накшталт, «рыбай, бывае, толькі і харчуемся».

Самыя «гарачыя галовы» зацікавіліся, які прыблізна памер фінансавай страты ад мору? І няўжо эколагам, уладзе насамрэч усё роўна?

Кампетэнтны каментарый

У Віцебскім камітэце прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя без валакіты пагадзіліся праясніць сітуацыю.

— Карасёва знаходзіцца на тэрыторыі Багушэўскага лясніцтва аднайменнага лясгаса. Плошча воднай роўнядзі — 12,1 гектара. Яно ў лесе, магчымасць пад'езду аўтатранспартам адсутнічае. Возера ў стадыі зарастання. Тоўшча вады складае 1,2—1,5 метра, — канстатавалі ў прыродаахоўным ведамстве.

Наконт самой рыбы, яе відаў. У асноўным у Карасёве плавае карась (адсюль і назва возера). Водзяцца плотка, краснапёрка, акунь, рэдка — шчупак.

Супрацоўнікі Сенненскай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя 11 сакавіка правялі абследаванне і мёртвай рыбы ў возеры не знайшлі: ні ў прасвідраваных рыбакамі лунках, ні ў прамывінах каля берагоў...

— Яна была знойдзена ў пратоцы, за 70—100 метраў ад возера. Бліжэй трапляліся толькі адзінкавыя асобіны. Па сведчанні рыбакоў, рыба пайшла ў пратоку прыкладна ў сярэдзіне студзеня. У гэты час наступілі вялікія маразы, і пратока цалкам прамерзла разам з рыбай. Калі растаяў лёд, яна апынулася на паверхні. Па прыблізных падліках, на момант абследавання, у вадзе знаходзілася каля 200 кіло мёртвай рыбы, — паведамілі ў інспекцыі.

Карасёва злучана з іншымі азёрамі пратокамі шырынёй 1,5—3 метры і глыбінёй — у перыяд нізкага ўзроўню вады — не больш за 0,6—0,7 метра.

І рыбе, і дзяржаве будзе добра...

Асаблівасць і каштоўнасць возера, як ні дзіўна, не ў рыбе. А ў сапрапелі. Па інфармацыі органа мясцовай улады, Карасёва вельмі прывабнае для прамысловай здабычы.

Цікава, што яшчэ 25 гадоў таму прадстаўнікі навукова-даследчага інстытута са Смаленска працавалі на возеры. Навукоўцы вызначылі, што паклады сапрапелю маюць «вышыню» прыкладна 7,5—9,5 метра. Быў распрацаваны адпаведны праект для ахвотных інвеставаць у іх здабычу.

— Летам водная роўнядзь на Карасёве практычна адсутнічае, бо зарастае воднай расліннасцю, — дадалі ў інспекцыі.

Канешне, у такіх умовах здабываць каштоўнае прыроднае ўгнаенне можна пры мінімуме выдаткаў. Тым больш, што інвестарам у нашай краіне «зялёнае святло». Умовы для дзейнасці вельмі прыцягальныя і падтрымка гарантуецца на самым высокім узроўні мясцовай улады.

Аляксандр ПУКШАНСКІ. *pukshanski@zviazda.by*

■ Пасля Чарнобыля

Зусім хутка наша краіна адзначыць чарговую, 31-ю гадавіну з дня аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Што за гэты час адбылося з забруджанымі землямі і якіх змен у свядомасці беларусаў патрабуе сучаснасць, расказала першы намеснік начальніка Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Марыя ГЕРМЯНЧУК.

Фота БЕЛТА.

На стацыянарнай даследчай станцыі «Масаны» Палескага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка вядзецца пастаяннае назіранне і радыяцыйны маніторынг раслінага і жывёльнага свету, вады і грунтаў.

ПАСТУПОВА НЕБЯСПЕКА ПАМЯНШАЕЦЦА...

Як беларускі вопыт і сучасныя распрацоўкі дапамагаюць сачыць за радыяцыйным становішчам у краіне і за мяжой

Небяспечная «спадчына»

Аналіз шматгадовай дзейнасці сістэмы кантролю і маніторынгу радыеактыўнага забруджвання навакольнага асяроддзя сёння дазваляе гаварыць, што паступова небяспека памяншаецца. Ідзе радыеактыўны распад цэзію-137 і стронцыю-90, спецыялісты пастаянна кантралююць дозы апраменьвання насельніцтва на радыяцыйна забруджаных тэрыторыях, на належным узроўні падтрымліваюцца меры радыяцыйнай аховы ў сельскай, лясной гаспадарцы.

Калі ў 1986 годзе плошча радыеактыўнага забруджвання склала 23% ад усёй тэрыторыі краіны, то, па разліках спецыялістаў, да 2046 года забруджанымі застануцца не больш за 10%. Выключэннем з'яўляецца тэрыторыя Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка. Менавіта тут паступова ўзрастае колькасць такога небяспечнага прадукту распаду плутонію-241, як амерыцыю-241, і ў 2058 годзе яго актыўнасць дасягне максімуму. Пры гэтым забруджванне амерыцыем не выклікае пагрозы для асноўнай масы насельніцтва — па даных маніторынгу, сур'ёзную шкоду патэнцыйна нанесці ён можа толькі на тэрыторыі запаведніка, якая закрытая для наведвання. Людзі там пастаянна не пражываюць, на гэтай зямлі вядуцца толькі навуковыя і суправаджальныя работы.

З 2015 года Беларусь з'яўляецца добраахвотным удзельнікам еўрапейскай сістэмы абмену радыелагічнымі данымі нацыянальных сетак маніторынгу EURDEP, у якой супрацоўнічаюць больш за 30 краін Еўропы.

Разам з тым сусветная практыка паказвае, што мы ўжо выйшлі з сітуацыі, якую Міжнародная камісія па радыяцыйнай ахове характарызуе як «сітуацыю аварыйнага апраменьвання». Сёння мы жывём у «сітуацыі існуючага апраменьвання», і нам давядзецца суіснаваць з радыеактыўным забруджваннем гады і дзесяцігоддзі.

Гэты пераход патрабуе перагляду нарматыўна-заканадаўчай базы, адыходу ад паняцця «зона забруджвання», уводу новай класіфікацыі гэтых тэрыторый і, што важна, змен у псіхалогіі людзей. Нам трэба адысці ад сіндрому чарнобыльскай ахвяры і ўсвядоміць, што гэтыя тэрыторыі — проста тэрыторыі з асаблівым статусам, дзе можна жыць і працаваць. Канешне, з абавязковым выкананнем мер радыяцыйнай бяспекі ў сельскай і лясной гаспадарцы, аздараўленнем дзяцей, высакаякасным медыцынскім абслугоўваннем насельніцтва.

Сачыць за мірным атамам

Горкі вопыт, які мы атрымалі «дзякуючы» Чарнобыльскай катастрофе, патрабуе эфектыўнай работы сістэмы кантролю і маніторынгу радыяцыйнага становішча вакол патэнцыйна небяспечных ядзерных аб'ектаў, адным з якіх з'яўляецца і будучая Беларуская АЭС. На работу спецыялістаў Гідрамета ў гэтым кірунку звяртаюць увагу многія замежныя эксперты. Многія з іх прыдзірліва, часам нават прадузята адносяцца да таго, як вакол БелАЭС праводзіцца радыяцыйна-экалагічны маніторынг навакольнага асяроддзя.

Аўтаматызаваная сістэма кантролю радыяцыйнага становішча (АСКРС), што сёння дзейнічае ў краіне, створана на аснове беларускіх распрацовак, якія адпавядаюць еўрапейскаму ўзроўню. У рэжыме рэальнага часу ўся інфармацыя з аўтаматычных пунктаў вымярэнняў паступае ў Мінск, апрацоўваецца і аналізуецца. Збор даных яшчэ да ўводу ў эксплуатацыю атамнай станцыі дазволіць стварыць аснову, «нулявую кропку», каб потым заўважыць нават самыя нязначныя магчымыя ўздзеянні на навакольнае асяроддзе.

Сістэма таксама здольная выяўляць момант узнікнення аварыйнай сітуацыі — калі раптам у паветры з'явяцца «свежыя» прадукты дзялення, перш за ўсё, радыеактыўныя ізатопы ёду. Падчас чарнобыльскай катастрофы менавіта іх уздзеянне на шчытападобную залозу дзяцей і падлеткаў стала самай вялікай праблемай у медыцынскім плане. На аўтаматычных пунктах вымярэння ўстаноўлена абсталяванне вытворчасці беларускага навукова-вытворчага ўнітарнага прадпрыемства «Атамтэх», якое дазваляе ў рэальным часе вызначаць наяўнасць у атмасферным паветры «свежых» прадуктаў дзялення.

Новыя пагрозы

Калі Беларуская АЭС толькі будуецца, то ў краінах-суседках многія атамныя станцыі ўжо маюць працяглы стаж работы. І праз некаторы час, калі выпрацуюць свой рэсурс, яны будуць выводзіцца з эксплуатацыі. Гэты перыяд дзейнасці АЭС спецыялісты называюць адным з самых небяспечных для насельніцтва і навакольнага асяроддзя.

Найбольшая рызыка, паводле класіфікацыі МАГАТЭ, існуе падчас разгрузкі актыўнай зоны рэактара і перавозкі апраменена паліва: сістэмы працуюць не ў звычайным рэжыме, можа адбыцца ДТЗ ці іншы надзвычайны выпадак. Акрамя таго, у гэты перыяд становіцца больш уразлівай фізічная ахова аб'екта, што дае магчымасці для дзейнасці радыелагічных тэрарыстаў. Сёння пытанні, на жаль, рэальнай пагрозы радыелагічнага тэрарызму абмяркоўваюцца на высокіх узроўнях у многіх краінах свету.

Калі ішла гаворка пра ваенныя дзеянні на тэрыторыі Украіны, беларуская гідраметэаралагічная служба ўважліва назірала за сітуацыяй на Запарожскай АЭС — пры

За дзесяцігоддзі работы па праблемах чарнобыльскага забруджвання ў краіне склалася навуковая школа беларускай радыеэкалогіі. Разам з еўрапейскімі калегамі нашы спецыялісты падрыхтавалі Атлас радыеактыўнага забруджвання Еўропы цэзіем-137, стварылі Атлас сучасных і прагнозных аспектаў наступстваў аварыі на Чарнобыльскай АЭС на пацярпелых тэрыторыях Расіі і Беларусі. Сярод іх — Вольга Жукава, Марына Падгайская, Генадзь Анцыпаў, Вольга Лугаўская, Іосіф Баўдзевіч, я, Марыя Гермянчук, і многія іншыя. Як адзін з кіраўнікоў гідраметэаралагічнай службы Беларусі, я выказваю шчырую ўдзячнасць за выкананую імі работу, за самаадданасць, найвышэйшы прафесіяналізм і вернасць сваёй справе, сваёй краіне.

ўзнікненні радыяцыйнай пагрозы паветраныя масы маглі данесці ў Беларусь магчымае забруджванне. Цяпер гэта небяспека знізілася, тым не менш мы працягваем назіраць за сітуацыяй, каб пры неабходнасці хутка адрэагаваць на пагрозу.

Аварыя на АЭС Фукусіма-1 (Японія, 2011 год) і пажар на АЭС Фламанвіль (Францыя, 2017 год) паказалі, што беларускія сістэмы маніторынгу выдатна рэагуюць на радыеактыўнае забруджванне навакольнага асяроддзя, якое можа адбыцца далёка ад нашай краіны. І нават калі ў апошнім выпадку выкідаў радыеактыўнасці не было, разам з калегамі з Расіі беларускія спецыялісты адразу склалі карты прагнозных траекторый пераносу патэнцыйнага забруджвання і ацанілі ступень патэнцыйнай небяспекі для нашых краін.

Падрыхтавала Вераніка КОЛАСАВА

Годовой отчет ОАО «Строительный трест №9 г. Витебск»
за 2016 год

Учетный номер плательщика	300029266
Вид экономической деятельности	Общее строительство зданий
Адрес	210015, г. Витебск, ул. Марка Шагала, 5-1
Единица измерения	тыс. руб.

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 31 декабря 2016 года

Активы	Код строки	На 31 декабря 2016 года	На 31 декабря 2015 года
1	2	3	4
1. Долгосрочные активы			
Основные средства:			
остаточная стоимость	110	7398	7809
Нематериальные активы:			
остаточная стоимость	120	2	–
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	(10)	(10)
Итого по разделу 1	**190**	**7390**	**7802**
2. Краткосрочные активы			
Запасы	210	1649	1348
в том числе: материалы	211	1297	1123
незавершенное производство	213	297	186
готовая продукция и товары	214	55	39
Расходы будущих периодов	230	11	46
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	3152	4685
по налогам и сборам в бюджет	251	–	12
инвестиционного фонда Минстройархитектуры	252	37	37
Денежные средства и эквиваленты денежных средств	270	83	284
Прочие краткосрочные активы	280	11	79
в том числе недостачи и потери	281	11	79
Итого по разделу 2	**290**	**4906**	**6444**
Баланс	**300**	**12 296**	**14 246**
3. Собственный капитал			
Уставный капитал	410	813	813
Резервный капитал	440	13	13
Добавочный капитал	450	8578	8659
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	(4222)	(1590)
Итого по разделу 3	**490**	**5182**	**7895**
5. Краткосрочные обязательства			
Краткосрочные кредиты и займы	610	606	617
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	6508	5734
в том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	5481	4605
по авансам полученным	632	178	174
по налогам и сборам	633	260	301
по социальному страхованию и обеспечению	634	130	108
по оплате труда	635	240	348
прочим кредиторам	638	219	198
Итого по разделу 5	**690**	**7114**	**6351**
Баланс	**700**	**12 296**	**14 246**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ
за январь–декабрь 2016 года

Наименование показателей	Код строки	За январь – декабрь 2016 года	За январь – декабрь 2015 года
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	6166	15 313
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	6392	15 160
Валовая прибыль (010 - 020)	030	(226)	153
Управленческие расходы	040	(999)	(1778)
Расходы на реализацию	050	(–)	(–)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030 – 040 – 050)	060	(1225)	(1625)
Прочие доходы по текущей деятельности	070	565	1119
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(847)	(1489)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (± 060 + 070 – 080)	090	(1507)	(1995)
Доходы по инвестиционной деятельности	100	62	18
в том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	59	18
проценты к получению	103	3	–
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(11)	(3)
в том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	6	3
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	5	–
Доходы по финансовой деятельности	120	1	22
в том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	1	18
прочие доходы по финансовой деятельности	122	–	4
Расходы по финансовой деятельности	130	(100)	(249)
в том числе:			
проценты к уплате	131	100	248
прочие расходы по финансовой деятельности	133	–	1
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100 – 110 + 120 - 130)	140	(48)	(212)
Прибыль (убыток) до налогообложения (± 090 ± 140)	150	(1555)	(2207)
Налог на прибыль	160	(–)	(3)
Чистая прибыль (убыток) (± 150 – 160 ± 170 ± 180 – 190 – 200 ± 205)	210	(1555)	(2210)
Совокупная прибыль (убыток) (± 210 ± 220 ± 230)	240	(1555)	(2210)
Базовая прибыль (убыток) на акцию, руб.	250	(0,0300)	(41,0000)

Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности по состоянию на 1 января 2017 г.

Доля государства в уставном фонде эмитента 99,86 (всего в процентах), в том числе:

Вид собственности	Количество акций, шт	Доля в уставном фонде, %
Республиканская	54 124 733	99,86

Количество акционеров, всего – 881.
в том числе:
юридических лиц – 1, из них нерезидентов Республики Беларусь (нет).
физических лиц – 880, из них нерезидентов Республики Беларусь (1)

Информация о дивидендах и акциях

Наименование показателей	Ед. изм.	С начала года	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	тыс. руб	-	-
Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде	тыс. руб	-	-
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	руб.	-	-
Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги)	руб.	-	-
Обеспеченность акции имуществом общества, всего	руб.	0,14	0,14
Количество простых акций, находящихся на балансе общества	штук	-	-
Просроченная дебиторская задолженность	тыс. руб.	400	2014
Просроченная кредиторская задолженность	тыс. руб.	4688	3942

Среднесписочная численность работающих (человек) – 703.
Основной вид деятельности : общее строительство зданий.
Дата проведения годового общего собрания акционеров, на котором утверждался годовой бухгалтерский отчет за отчетный 2016 год – 29.03.2017 г.
Выплата дивидендов за 2016 год не производится в связи с наличием убытка по итогам работы за 2016 год.
Справки по телефону (8-0212) 60-28-93

Генеральный директор В. П. Ленчиков

Главный бухгалтер В. И. Цурикова

ИП Тихонович Юрий Константинович проводит первый повторный открытый аукцион по продаже недвижимого и движимого имущества, расположенного по адресу: Брестская обл., Пружанский р-н, Ружанский с/с, г. п. Ружаны, ул. Советская, 9А, находящегося на праве хозяйственного ведения у унитарного предприятия «Ружанская мебельная фабрика»

№ лота	Наименование	Ед. изм.	Кол-во	Начальная стоимость предмета торгов без НДС, бел. руб.	Ставка НДС	Сумма НДС, бел. руб.	Цена предмета торгов с НДС, бел. руб.	Сумма шага аукциона в размере 5%, бел. руб.	Размер задатка за участие в аукционе 10%, бел. руб.
1	Комплекс объектов недвижимого и движимого имущества, расположенных по адресу: Брестская обл., Пружанский р-н, Ружанский с/с, г. п. Ружаны, ул. Советская, 9А, находящихся на праве хозяйственного ведения у унитарного предприятия «Ружанская мебельная фабрика», стоимость которого уменьшена на 30%: • Здание главного производственного корпуса, инвентарный №124/С-17630 • Водопровод наружный • Сеть водопроводная • Водопровод наружный • Внутренняя канализация • Самотечная канализация • Забор железобетонный • Забор декоративный • Забор железобетонный • Забор железобетонный • Ограждение мусорки • Внутриплощадочные дороги и проезды • Ворота секционные подъемные СПР 3850*4120 • Ворота секционные подъемные СПР 4040*4120 • Ворота секционные подъемные СПР 3750*3100 • Калитка к воротам секционным подъемным СПР 4040*4120 (размер калитки 970*2000) • Котельная инв. №124/С-17631 • Теплотрасса • Теплотрасса (участок №3) • Пожарный резервуар • Трансформаторная подстанция инв. №124/С-17877 • Силовые кабельные сети (здание АБК) • Силовые кабельные сети (здание главного корпуса) • Силовые кабельные сети (здание склада готовой продукции) • Здание склада гаража инв. №124/С-17628 • Здание механической мастерской №124/С-17626 • Здание склада тех. материалов, здание склада под картон, здание гаража инв. №124/С-17624 • Здание склада готовой продукции инв. №124/С-17627 • Здание административно-бытового корпуса инв. №124/С-17634 • Здание склада материальных материалов инв. №124/С-17629 • Здание проходной инв. №124/С-17633 • Здание участка пожаротушения инв. №124/С-17874 • Дымовая труба (32 м) инв. №160/С-28863 • Дымовая труба (28 м) инв. №160/С-28862 • Насосная станция инв. №124/С-17876 • Здание хранения лака инв. №160/С-28963 • Центр раскроя с одной линией распила EB-95 • Деревообрабатывающий центр с ЧПУ РОВЕР для фрезерирования • Обрабатывающий центр в ЧПУ мод. РОВЕР • Обрабатывающий центр с ЧПУ РОВЕР 2.30 • Обрабатывающий центр в ЧПУ РОВЕР S K 3 • Обрабатывающий центр с ЧПУ РОВЕР C 6.40 • Присадочный центр с ЧПУ мод. SKIPPER 100 • Калибровально-шлифовальный станок • Шлифовальный агрегат с абразивными щетками мод. PROFISANDER-2 • Покрасочная кабина Италия • Покрасочная кабина Италия • Покрасочная кабина Италия • Распылительная установка мод. SUPERFICI • Сушильная камера вертикальная (CONTIVERT SUPERFIC) • Пресс гидродинамический мод. PHF/100 в комплекте • Гидродинамический пресс холодного прессования мод. PM/DE/1 LL • Весы клеепромазывающие мод. SC2R-FIN • Компрессор воздушный винтовой EKO 30. Турция VST • Осушитель холодным воздухом НЧДр300 • Компрессор CSB 25/8 • Осушитель воздуха мод. ARCTIC F 8000-FINI • Котел паровой Е-1-9-Р3 • Водогрейный котел КВ-ТС1 • Насос UPS 32-30 • Насос НГ 1.6-1.6 • Насос НГ 1.6-1.6 • Установка дозаторная • Дымосос ДН-2 • Дымосос ДН-6.3 • Дымосос ДН-6.3 • Компрессор CSA 20/8-50D • Обрабатывающий центр с ЧПУ мод. MD DRILL-COMEC • Линия для облицовки профилей Barberan • Покрасочная камера мод. Р.5.В • Пресс АКДА • Подающее устройство (клеенамазывающие вальцы) • Трактор Беларус 82.1 (рег. знак АВ-1 7125) • Полуприцеп ПМТ-330 (рег. знак АВ-1 8316) • Погрузчик Хели CPCД30 (зав. №01030D8890HJ) • Машина погрузочная МП-320 (рег. знак АВ-1 8315) • Щетка дорожная НО-86 (зав. №1388)								
2	Объект недвижимости, расположенный по адресу: Брестская обл. Пружанский р-н, Ружанский с/с , г.п. Ружаны, ул. Коссовская, 7А, находящийся на праве хозяйственного ведения у унитарного предприятия «Ружанская метельная фабрика», капитальное строение с инвентарным номером 124/С-17635 (здание магазина), стоимость которого уменьшена на 20%	шт	1	178 503,84	20	35 700,77	214 204,61	10 710,23	21 420,46
3	Объект движимого имущества, находящийся на праве хозяйственного ведения у унитарного предприятия «Ружанская мебельная фабрика», калибровально-шлифовальный станок (инвентарный номер 1687)	шт	1	22 153,92	20	4 430,78	26 584,70	1329,24	2 658,47
	Итого:		**3**	3 036 882,68		607 376,53	3 644 259,21	182 212,96	364 425,92

Первый повторный аукцион состоится 21 апреля 2017 года в 10.00 по адресу: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 206

Заявления на участие в аукционе с приложением копий свидетельств о государственной регистрации, доверенностей, выданных представителю (для юридических лиц и ИП), или копий паспортов (для физических лиц), заверенных банком документов, подтверждающих внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет Унитарного предприятия «Ружанская мебельная фабрика», принимаются с момента опубликования настоящего извещения по **20 апреля 2017 года** до 16.30 по адресу: г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 206 или по факсу 80162-33-93-88.

Шаг аукциона равен пяти процентам от начальной цены имущества. Договор купли-продажи между Продавцом и Покупателем заключается в течение 10 (десяти) дней с даты проведения торгов. Победитель аукциона обязан оплатить предмет торгов в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее пятнадцати банковских дней с момента заключения договора. Победитель аукциона возмещает расходы, связанные с проведением торгов в части оплаты объявления о проведении торгов и оценки предмета торгов в течение 5 дней с даты проведения торгов.

Размер задатка для участия в аукционе составляет 10% от начальной цены имущества и перечисляется на расчетный счет Унитарного предприятия «Ружанская мебельная фабрика» №3012000000448 в ЦБУ №122 филиала №113 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Пружаны, ул. Заводская, 16, код 237, УНП 200254688 в срок до **20 апреля 2017 года**.

Победителем аукциона признается лицо, предложившее наиболее высокую цену за лот.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником, предмет торгов продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Результаты по проведению торгов оформляются протоколами.

Сведения об организаторе торгов: индивидуальный предприниматель Тихонович Юрий Константинович, адрес: 224033, г. Брест, ул. Сябровская, д. 75, кв. 7, контактные телефоны: 80162-33-93-88, 80162-58-45-79, 8-029-802-80-00.

Сведения о продавце: унитарное предприятие «Ружанская мебельная фабрика», Брестская обл., Пружанский район, г. п. Ружаны, ул. Заводская, 16, контактный телефон: 8-044-352-11-47.

Организатор открытых торгов после опубликования извещения о проведении торгов вправе отказаться от их проведения при продаже имущества должника на аукционе – в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

Иную информацию о порядке и условиях проведения торгов, ознакомлении с предметом торгов можно получить в рабочие дни с 09.00 до 16.30 по адресу: 224022, г. Брест, ул. Ясеневая, 20А, офис 206, тел.: 8-029-802-80-00, 80162-58-45-79.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика	Изолированное помещение, инв. № 422/D-28190 (назначение – торговое помещение, наименование – торговое помещение № 1), площадью 1487,4 кв. м, расположенное по адресу: Щучинский р-н, г.п. Острино, ул. Гродненская, 7-1
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 425856600002000051, площадью 0,2531 га (назначение – для обслуживания здания магазина «Универмаг») по адресу: Щучинский р-н, г.п. Острино, ул. Гродненская, 7. Земельный участок выделен под капитальное строение, оформление пользования земельным участком будет производиться в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь
Начальная цена продажи	98 900 (девяносто восемь тысяч девятьсот рублей) с учетом НДС
Сумма задатка	4 945 р. (четыре тысячи девятьсот сорок пять рублей)
Продавец	Щучинский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231513, г. Щучин, ул. Пушкина, 26
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 41-98-32
Условия аукциона	Аукцион без условий
Условия оплаты	Рассрочка платежа за приобретаемое имущество сроком 5 лет, с уплатой первоначального взноса до подписания договора купли-продажи в размере 20% от договорной стоимости, с погашением оставшейся суммы ежемесячно равными долями не позднее 30 числа месяца начиная с месяца, следующего после заключения договора купли-продажи
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 5 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области БИК 153001739 УНП 500833225
Аукцион состоится 12 мая 2017 г. в 11.00 по адресу: г. Щучин, ул. Пушкина, 26	

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов по названной аукционистом цене. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг), с 8.30 до 16.30 (пятница) Последний день приема заявлений – 4 мая 2017 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»
http://grodnoino.by/

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

извещает о проведении открытого аукциона по продаже транспортных средств, принадлежащих ГИПК «ГАЗ-ИНСТИТУТ» на праве оперативного управления

№ Лота	Описание	Начальная цена с учетом НДС 20%, бел. руб.	Задаток, бел. руб.
Лот №1	Автогидроподъемник ПМС-328 на базе шасси MAZ 5337 A2 340PMS 328D кузов (рама) №Y39PMC328B2008128/ Y3M5337A2B0003806, 2011 г. в. Цвет – серый. Грузоподъемность люльки – не более 250 кг. Рабочая высота подъема – 28-0,3 м. Вылет (м. не более) – 13,8	19 926,72	996,34
Лот №2	Экскаватор ЭО 2621 В-2 (на базе трактора «Беларусь» ЮМЗ 6кл). Заводской №146193, 1988 г. в. Заводской №573272. Двигатель: Д-65М №8Б2181. Емкость штатного ковша – 0,25 куб. м. Вылет стрелы при наибольшей высоте подъема – 2,3 м	3 584,58	179,23
Лот №3	Автокран КС 4572 на базе КамАЗ 53213 кузов (рама) №ХТС532130К0021116/532130021116. Тип ТС – грузовой специальный кран. 1989 г. в. Разрешенная масса – 16 000 кг. Цвет – темно-зеленый. Грузоподъемность максимальная – 16 т. Длина стрелы – 9,7….21,7 м.	3 327,01	166,35
Местонахождение лотов – Гомельская обл., г. Гомель, пер. Ильича 8-й, д. 30			

УСЛОВИЯ

1. Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
2. Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи Объекта (Объектов).
3. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.
4. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона

Аукцион состоится 25.05.2017 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%

Порядок оформления участия в аукционе содержится на сайте Организатора аукциона ino.by.

Продавец: ГИПК «ГАЗ-ИНСТИТУТ» 220038, г. Минск, 1-й Твердый переулок, д. 8, комн. 405, т.(017) 294-65-11

Организатор аукциона: РУП «Институт недвижимости и оценки» 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9, 8 (017) 306-00-57

Задаток перечисляется на р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе по продаже транспортных средств, принадлежащих ГИПК «ГАЗ-ИНСТИТУТ», проводимом 25 мая 2017 г.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, 11, каб. 6. **Окончание приема заявлений** 23.05.2017 в 11.00. Все желающие могут предварительно ознакомиться с Объектами. Контактное лицо для осмотра Объектов – Матвеенко Александр Васильевич, 8044 780 64 97.

Организатор аукциона имеет право отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее, чем за три дня до наступления даты его проведения

☎ Организатор аукциона: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

■ Руплівым гаспадарам

Пашпарт для бульбы

Ці ведалі вы, што ў бульбы ёсць пашпарт? Прычым інфармацыі ў ім на некалькі старонак — пра паходжанне сорту, яго ўстойлівасць да хвароб і экстрэмальных умоў, тэхналогіі вырошчвання і захоўвання і нават «кулінарныя» ўласцівасці.

Каб вывесці новы сорт бульбы, вучоным трэба 11—12 гадоў! Са ста тысяч сеянцаў селекцыянер адбірае адну расліну, з якой пачынае працаваць. Прычым падыходзіць да яе «нашчадкаў» даволі жорстка, вельмі шмат выбракоўваецца на кожным этапе. Раслінам давядзецца прайсці не адно выпрабаванне як у лабараторных, так і ў палявых умовах. Іх нават штучна будуць затопліваць і стварыць засуху, заражаць хваробамі. Вучоныя сочаць, як расліны пачуваюць сябе на розных глебах і ў розных рэгіёнах, правяраюць, як клубні пераносяць механізаваную ўборку. Карацей, стварэнне новага сорту — вялікая і складаная праца, да якой на ўсіх этапах падключаюцца спецыялісты розных лабараторый. У Інстытута бульбаводства Акадэміі навук поле для дзейнасці больш за 150 гектараў — гэта плошчы, на якіх вядзецца селекцыйная, насенняводчая работа, і адпрацоўваюцца тэхналагічныя пытанні, звязаныя са стварэннем агратэхнічных пашпартоў для новых сартоў бульбы. Ёсць і плёначныя цяпліцы, занятыя пад стварэнне новых гатункаў «другога хлеба». Бульба нават вырошчваецца праз прабірку.

— Гэта неад'емнае звяно ў вырошчванні бульбы, — тлумачыць **загадчык лабараторыі тэхналогій вытворчасці і захоўвання бульбы Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па бульбаводстве і плодаагародніцтве Дзмітрый ФІЦУРА**. — Праз прабірку пасадачны матэрыял атрымліваецца чысты, без інфекцый — найперш без віруснай, што вельмі важна ў пачатку насенняводства, бо ў далейшым гэта можа адбівацца на ўраджаі і якасцях новага сорту.

— Якія хваробы людзі набываюць з няякасным насеннем?

— На першым месцы — віруснья. У Расіі фіксаваліся завозы разам з насенным і харчовым таварам каранцінных хвароб, такіх як кальцавая, бурая гніль. У нас былі выпадкі завозу бульбы з паражэннем серабрыстай паршой — яна праяўляецца ў перыяд захоўвання, прычым плямы на сухіх клубнях можна і не заўважыць.

— Як не атрымаць сур'ёзную праблему, бо хваробы могуць «кватараваць» у зямлі не адзін год?

— Я раіў бы агароднікам набываць насенне ў праверaных вытворцаў. Напрыклад, можна звяртацца на абласныя доследныя вопытныя станцыі, у спецыялізаваныя буйныя гаспадаркі, а таксама ў наш інстытут у Самахвалавічах.

Калі расліна слабаразвітая, прыгнечаная, у яе можа быць некалькі хвароб адначасова. Прымета дзеяння вірусаў — маршчыністасць, скручванне, мазаіка лісця, нехарактэрнае лісце і бацвінне для сорту. Дарэчы, такім чынам расліна можа «заяўляць» і пра недахопы харчавання, пэўных элементаў. Але хваробы могуць быць не толькі на насенні, у глебе, але і дадавацца пры вырошчванні. Напрыклад, тлі пераносяць вірусную інфекцыю.

— Якая самая частая памылка агароднікаў?

— Памылкі розныя, напрыклад, вельмі ранняя пасадка. Саджаць бульбу можна, калі глеба прагрэлася на глыбіню 7—8 см. Аптымальныя тэрміны пасадкі для цэнтральнай часткі краіны — трэцяя дэкада красавіка — першая дэкада мая, у паўднёвай — 2-3-я дэкада красавіка. У першую дэкаду красавіка можна паспрабаваць пасадзіць бульбу толькі, калі ёсць мэта атрымаць раннюю прадукцыю. І тое ёсць рызыка вяртання халадоў. Калі пасадзіць бульбу вельмі рана, расткі могуць пашкоджвацца рызактаніёзам — усходы будуць зрэджаныя. У цёплае надвор'е гэта хвароба можа і не праявіцца. Перад пасадкай бульбу абавязкова трэба прагрэць і прарасціць. Калі яна пазелянеўшая, гэта добры задзел для атрымання дружных і здаровых усходаў.

— Ці трэба яе надразаць на 5—8 міліметраў?

— Аматары могуць паэксперыментаваць — так яны дадуць імпульс для прабуджэння ўсіх вочак на бульбіне. Важна пасля гэтага насенне падсушыць, каб рана зарубцавалася. Але ўсё ж я б не рэкамендаваў яе рэзаць, каб не занесці інфекцыю. А яшчэ насенне добра апрацаваць рэгулятарамі росту, мікраўгнаеннямі, асартымент такіх прэпаратаў даволі вялікі. Можна згадаць экасіл, паліком-бульба, камплімет-бульба, нанаплант і іншыя. А можна дзейнічаць прасцей: узяць агульнадаступныя прэпараты — борную кіслату, медны купарвас і марганцоўку. Гэта і абеззаражванне пасадачнага матэрыялу, і стымул для росту і развіцця бульбы. Пажадана праводзіць апрацоўкі раслін мікраэлементамі, мікраўгнаеннямі пачынаючы з фазы, калі бацвінне крыху сфарміравалася (вышыня — 20 см), далей — у пачатак бутанізацыі. Можна сумяшчаць падкормкі з фунгіцыднымі апрацоўкамі, толькі пры гэтым праверыць прэпараты на сумяшчальнасць. Калі расліна атрымлівае добрае харчаванне, яна моцная, нават дзеянне вірусаў будзе нівеліравана.

— А як атрымаць ураджай без «хіміі»?

— Мы праводзілі даследаванні па арганічнай тэхналогіі вырошчвання бульбы. Так, біялагічныя прэпараты бяскшкодныя, але іх трэба прымяняць часцей, чым хімічныя. Такія ёсць і супраць шкоднікаў, у тым ліку каларадскага жука (бітаксібацылін, бацытурын, ксантрэл), фітафтарозу і альтанарыёза (ксантрэл, бактофіт, фітаспарын-М).

— Ці рэальна вырасціць бульбу без фітафторы?

— Трэба аддаваць перавагу ў вырошчванні бульбы ўстойлівым да гэтай хваробы сартам. Есць шэраг такіх, напрыклад, сярод ранніх — «Лілея», сярэдняпозніх і позніх: «Атлант», крахмалістыя сарты «Здабытак», «Рагнеда», «Акцэнт». Ёсць сарты, устойлівыя да паршы: «Скарб», «Брыз», «Журавінка», «Вектар». Важна прытрымлівацца севазвароту і выкарыстоўваць біялагічныя прэпараты. Заўважу, што ў сувязі з пацяпленнем клімату ўсё больш нарастае праблема з альтэрнарыёзам. Фітафтароз вы распазнаяце па мучністым налёце, альтэрнарыя — гэта канцэнтрычныя плямы карычневага колеру на лісце. Альтэрнарыёз асабліва праяўляецца ў спякотныя, сухія гады — плямкі могуць з'явіцца нават у чэрвені. Прэпаратаў ад гэтай хваробы недастаткова. Часта яны малаэфектыўныя, бо з'яўляюцца новыя штамы, устойлівыя да іх.

— Спалучэнне бульбы з бабовымі можа быць прафілактыкай хвароб і нашэсця шкоднікаў?

— У прыватным сектары сапраўды можна выкарыстоўваць падбор культур, і не толькі бабовыя, але і мяту, кроп. Старыя спосабы працягваюць працаваць. Напрыклад, агароднікі абараняюць свае градy тымі ж адварамі цыбулі, часнаку, крапівы, хвашчу, сасны, палыну. Але куды прасцей карыстацца біяпрэпаратамі.

— Што трэба ведаць пра глыбіню пасадкі і акучванне?

— Глыбіня пасадкі на лёгкіх глебах да 10 см, а на суглінках — да 8. Высокае акучванне вельмі важнае. Пры фарміраванні высокай градкі вакол куста да 22—25 см ствараюцца добрыя ўмовы для атрымання таварнага ўраджаю. А яшчэ мы выратоўваем ўраджай бульбы ад пазелянення. Акрамя таго, лічыцца, што паражэнне клубняў фітафторазом зніжаецца ў 2—5 разоў.

— На што трэба звярнуць увагу пры выбары сорту?

— У айчынным рэестры зараз 147 гатункаў, 48 — беларускай селекцыі (на гэты год зарэгістравалі ў дзяржрэестры сярэдняранні — «Палац» і сярэдняпозні — «Лель»). Кожны сорт мае свайго спажыўца, бо некаму трэба, каб бульба разварвалася, іншым — наадварот. Можна выбіраць з улікам формы і колеру лупіны і мякаці. Пажадана мець некалькі сартоў розных груп спеласці — гэта аснова для стабільнага атрымання ўраджаю, бо расліны па-рознаму рэагуюць на глебы, надвор'е, стрэсавыя ўмовы. Так, летась, здавалася, раннія сарты павінны быць больш ураджайнымі, але познія таксама далі добры ўраджай. Можна звяртаць увагу на ўмовы захоўвання: ёсць сарты з працяглым перыядам спакою, а ёсць тыя, што могуць рана «прачынацца». Можна раіць многія сарты — «Зорачка», «Уладар», «Маніфест», «Крыніца», «Волат», «Лад», «Журавінка», цяпер па плошчах на першае месца выходзіць «Брыз». Адзін з новых высокаўраджайных сартоў — «Вектар» — устойлівы да засухі. «Маг» — адзін з найлепшых сартоў для перапрацоўкі на чыпсы.

— Ураджайнасць дасягаецца ў многім за кошт таго, што сарты ўстойлівыя да хвароб?

— Гэта адзін з важкіх фактараў. Яшчэ важна, як расліна рэагуе на ўгнаенні, плюс патэнцыяльныя магчымасці сорту, якія закладзены генетычна. Мы рэкамендуем праз 4—5 гадоў абнаўляць пасадачны матэрыял, бо некаторыя сарты з цягам часу губляюць свае ўласцівасці. Так, у першыя гады яны даюць добрыя ўраджаі, а пасля ўраджайнасць можа рэзка зніжацца. Але ёсць і такія гатункі, якія доўга стабільна сябе праяўляюць, — напрыклад, «Скарб».

— Ці быць нашай бульбе ў «Макдональдсах»?

— Тут трэба пэўная біяхімія бульбы, ёсць патрабаванні па сухім рэчыве, рэдуцыруючых цукрах, устойлівасці да пацямнення. У нас такія сарты ёсць, і трэба больш перапрацоўваць на бульбапрадукты. Неабходна развіваць свае брэнды — тыя ж дранікі. Дарэчы, у інстытута ёсць лабараторыя, дзе якраз вывучаецца прыдатнасць будучых сартоў да перапрацоўкі, на якія бульбапрадукты яны падыходзяць, у тым ліку фры, дранікі, і апошні кірунак — для вакуумавання, што цяпер запатрабавана.

— Ці ёсць сарты для дыетычнага харчавання?

— Мы працуем і ў гэтым кірунку. Многа дыскусій: якія павінны быць паказальнікі ў такога прадукту. Між іншым, у бульбе, акрамя крухмалу, ёсць якасны бялок, вялікае ўтрыманне калію, вітаміну С. За мяжой праводзіліся даследаванні, якія паказалі, што на бульбяной дыеце можна нават скідаць вагу.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.
dziadziula@zviazda.by

■ Кнігазбор

ЕЎРАПЕЙСКІ ПОГЛЯД

У БІБЛІЯТЭЦЫ імя Урублеўскіх Літоўскай акадэміі навук нядаўна была выдадзена кніга «Рускай Бібліі» Францыска Скарыны — 500 гадоў» («Pranciskaus Skorinos «Ruseniskajai Biblijai» — 500»).

Яе аўтарамі з'яўляюцца даследчыкі гісторыі Вялікага Княства Літоўскага, гісторыі кнігі, літаратуры і мовы, якія прадстаўляюць розныя еўрапейскія краіны: Сігітас Нарбутас, Дайва Нарбутэне, Сяргеюс Цемчынас, Рыма Цыцэнене (Літва), Пётр Войт, Ілья Лямешкін (Чэхія), Аляксандр Груша (Беларусь). Прэзентацыя выдання адбылася ў Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа НАН Беларусі.

Пра тое, што можна ўбачыць у кнізе, расказаў **дырэктар бібліятэкі Акадэміі навук Літвы імя Урублеўскіх, рэдактар выдання Сігітас НАРБУТАС:**

— Скарына з'яўляецца адным з самых велічных людзей у сферы кнігавыдання. Мы задумалі гэты праект, каб паспрабаваць зноў перачытаць тыя дакументы, якія захаваліся, хоць і раскіданыя па розных кнігасховішчах, архівах Беларусі, Польшчы, Чэхіі, Італіі, Германіі, іншых краін, і паспрабаваць абнавіць уяўленні пра Скарыну і яго Біблію. Кніга, якую мы выпусцілі, з'яўляецца навукова-папулярным выданнем. Мы сабралі разам усе тыя звесткі, якія сучаснаму культурнаму чалавеку трэба ведаць пра Скарыну, пра абставіны і час, у якія ён тварыў. Таму ў кнізе, добра ілюстраванай, найперш прадстаўлена багатая традыцыя Вялікага Княства Літоўскага, з якой вырас Скарына. Даецца яго кароткая біяграфія, дзейнасць у Празе. А затым апісваецца кнігадрукаванне ў Вялікім Княстве Літоўскім пасля Скарыны, у поўным аб'ёме і на ўсіх мовах. Напрыканцы ў трох нарысах расказваецца, як цяпер успамінаюць Скарыну ў Беларусі, Літве і Чэхіі.

На прэзентацыі выдання ўпершыню была прадстаўлена карціна, створаная сёлета чэшскімі мастакамі па замове даследчыка Ільі Лямешкіна. На ёй Скарына выяўлены... без вусоў. Бо ёсць меркаванне: тое, што мы прызвычаіліся бачыць на гравюры Скарыны ў яго на твары — гэта насамрэч не вусы, а ўсяго толькі цень ад носа. Таму чэшскі мастак і паспрабаваў стварыць новы вобраз.

Яшчэ адна аўтарка выдання пра Скарыну, **супрацоўніца бібліятэкі імя Урублеўскіх Дайва НАРБУТЭНЕ** сказала:

— Пасля Скарыны кнігадрукаванне стала вельмі шматгранным па мовах, тэмах, змесце. У сваім артыкуле, змешчаным у гэтай кнізе,



я стараюся прааналізаваць сітуацыю ў кнігадрукаванні XVI стагоддзя, якая склалася пасля Скарыны. Як вы ведаеце, кнігадрукаванне аднавілася толькі праз 50 гадоў пасля прац Францыска. Кнігі выдавалі па-польску, па-лацінску, на царкоўнаславянскай мове і іншых.

Кніга выйшла на літоўскай мове. А цяпер рыхтуецца яе беларускае выданне, як адзначыў на прэзентацыі адзіны беларус у аўтарскім калектыве Аляксандр Груша, дырэктар Цэнтральнай навуковай бібліятэкі НАН Беларусі. Праўда, пакуль не вырашана, выйдзе яно па-беларуску ці па-руску.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ. *nina@zviazda.by*

500 гадоў беларускаму кнігадрукаванню
НАПАЧАТКУ БЫЛО СЛОВА

ПЕРШАСНАЕ

Што было найбольш важным для самога Скарыны?

500 гадоў таму Францыск Скарына першы надрукаваў кнігу на нашых землях. Ці можна лічыць выпадковым той факт, што гэта была менавіта Біблія? Што было першасным у яго справе — распачаць кнігадрук або ўсё-такі данесці да большай колькасці людзей Святое Пісанне? І, зрэшты, ці было тое, што ён выдаў, перакладам? Сваімі думкамі на гэту тэму за круглым сталом у Тэалагічным інстытуце дзяліліся даследчыкі і прадстаўнікі грамадскасці.

Разважаннямі пра тое, наколькі важнай была мова, якую выкарыстаў Скарына, падзяліўся **гісторык Юрась БАЧЫШЧА:**

— У прадмове Скарына пісаў, што «загадаў «Псалтыр» ціснуці рускімі словамі славянскае мовы... І асабліва з тае прычыны, што «мяне літасцівы Бог з гэтай мовы на свет пусціў». Скарына атаясамліваў мову, на якой ён друкаваў кнігі Бібліі, з той мовай, якой навучаўся ў Полацку са сваімі бацькамі. Верагодна, гэта была простая мова, гутарковая, а не мова высокай навукі. Але ў гэтым, мажліва, і заслуга Скарыны — ён адным з першых адаптаваў (ці пераклаў) для простых людзей царкоўнаславянскія тэксты. І выкарыстаў тую мову, якую лічыў роднай... Гэта менавіта тая мова, якая праз паўстагоддзя, у творах Цяпінскага і Буднага атрымае развіццё. І тады ўжо стане лепш заўважная яе беларускасць.

Вялікую асабістую працу па асэнсаванні Бібліі зрабіў **пастар царквы «Ян Прадвеснік» Антоній БОКУН**. У 2016 годзе выйшаў зроблены ім пераклад на беларускую мову Новага Завету і кнігі Прыпавесцяў. Ён падзяліўся думкамі адносна подзвігу першадрукара, які, безумоўна, яго натхніў:

— Па-першае, істотна тое, што сам Скарына называў сваю працу «Бібліяй Рускай» — у сучасным разуменні, «Бібліяй Беларускай». А па-другое, было б дзіўна ад першага вопыту перакладу чакаць моцнага адыходжання ад царкоўнаславянскай асновы. У кніжнай культуры таго часу існавала імкненне не аддаліць, а наадварот максімальна захаваць пераемнасць моў. Важнае і тое, што гэта першы датаваны пераклад Бібліі. Спробы перакладаць Святое Пісанне рабіліся і раней, але, на жаль, перакладчыкі не пазначалі дату. А Скарына ўказаў час. Таму можна казаць, што гэта пачатак перакладаў. Пазнейшыя аўтары таксама звярталіся да Скарыны і яго тэкст разглядалі не як царкоўнаславянскі, а менавіта як пераклад. Яго выданне адрозніваюць ад класічнага царкоўнаславянскага тэксту.

Рэктар Тэалагічнага інстытута Сяргей ПАДНЮК выказаў меркаванне, што праца Скарыны не была цалкам перакладам, бо ён і не ставіў перад сабой такіх мэт. Імкнуўся найперш выкарыстаць лексіку, прынятую ў тагачасным грамадстве, — устойлівыя выразы, характэрныя для рэлігійнай мовы. Нават калі Біблія перакладаецца ў наш час, словы з іншых моў часам наўмысна пакідаюць. Дарэчы, тагачасныя рэлігійныя дзеячы працу Скарыны не прызналі, бо яна была занадта наватарскай.

Вялікую ўвагу моўным нюансам надае і **культуролаг Ігар КЛІМАЎ**:

— Скарына арыентаваўся на чэшскі пераклад Бібліі, які рабіўся з лацінскай мовы. Першадрукар спрашчаў царкоўнаславянскую мову, прыбіраючы малазразумелыя словы, канструкцыі. Дарэчы, у розных кнігах, выдадзеных ім, былі розныя суадносіны царкоўнаславянскай і ўсходнеславянскіх лексік. Важна, што ўсе тагачасныя выданні Бібліі адрасаваліся пераважна царкоўнікам. А наватарства Скарыны палягае ў тым, што Біблію ён адрасаваў свецкім чытачам. Гэта было незвычайна ў тагачасных умовах. Да Рэфармацыі Пісанне было нечым прыналежным да сферы духавенства і епархіі. Цікава і тое супадзенне, што Скарына надрукаваў Біблію, а Марцін Лютар літаральна месяцам пазней абнародаваў тэзісы. З гэтага ўсё і пайшло...

На жаль, у нашым грамадстве не ўсе ўсведамляюць, што ж зрабіў першадрукар? Калі запытацца ў шараговага грамадзяніна, хто такі Скарына, не ўсе дадуць дакладны адказ.

— Што ж мы святкуем? Многія людзі не атаясамліваюць дзейнасць Скарыны з выданнем Бібліі. Хтосьці ведае, што ён першадрукар, хтосьці лічыць, што гэта быў пісьменнік, які ствараў казкі ці Буквар, — адзначае Юрась Бачышча. — А я задаюся пытаннем, калі б Скарына жыў у наш час, як бы ён хацеў, каб успрымалася яго дзейнасць, як адзначалася гэтае свята?.. Каб яго прадстаўлялі як першадрукара ці як лекара, бізнесмена?.. Калі мы зазіраем у словы яго прадмоў, дзе чытаем, дзеля чаго ён гэтым займаўся — каб даць Слова Божае простай мовай звычайным людзям, каб людзі яго чыталі і каб «лекі для душы і для цела» адтуль бралі. Бо ў Бібліі змешчана і найлепшае навучанне паводзінам, і самыя розныя навукі выкладзены. Я перакананы, што першасным для Скарыны было не надрукаваць кнігу — стаць першадрукаром, распачаць гэту справу на нашых землях. Для яго было найбольш важным выданне менавіта Бібліі, а друкарскі станок выкарыстоўваўся як інструмент — найбольш дасканалае прыстасаванне. У яго фокусе было — надрукаваць Біблію і даць яе свайму народу.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ. *nina@zviazda.by*

Пантэон Айчыны

ТРОЙДЗЕНЬ (? — 1282)

Пэўна, самы загадкавы правіцель Вялікага Княства Літоўскага. Сціплыя летапісныя звесткі пра Тройдзеня не дазваляюць сказаць нічога дакладнага. Таму паходжанне князя застаецца загадкай.

Відавочна, каб зрабіцца вялікім князем, у Тройдзеня павінна быць і законнае права, і сіла, і ўнутраная падтрымка. Магчыма, ён паходзіў з роду, з якога былі Міндоўг і Войшалк, і быў сынам старэйшага Міндоўгавага брата. Не выключана, што са сваім дзядзькам Таўцівілам ён апынуўся ў Полацку. Вёска Тройдзевечы каля Воладка паходзіць ад яго імя і можа сведчыць, што там ён жыў. Калі гэта так, дык Тройдзеня можна разглядаць як полацкага стаўленіка ў Літве. Пэўна, ён і кіраваў балцкай часткай Вялікага Княства ў Кернаве, а яго браты-хрысціяне — славянскай. Дванаццаць гадоў правіў Тройдзень — яны былі аднымі з самых цяжкіх у гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Да даўніх ворагаў лівонскіх рыцараў дадаліся рыцары з Тэўтонскага ордэна, які скарыў прускія плямёны, выйшаў да межаў Вялікага Княства і выношваў задумы заваяваць Літву

і Жамойць. Іншым небяспечным ворагам была Залатая Арда, якая падначаліла сабе Галіцка-Валынскае княства і праз яго жадала накінуць сваё ярмо і на Вялікае Княства Літоўскае. Жаданні не разыходзіліся са справай. І крыжакі, і татара-манголы хадзілі паходамі на ВКЛ, аднак гэтак і не дасягнулі сваёй мэты.

Пры Тройдзеню Вялікае Княства было падобна абложанай ворагамі цверджай. Жыццё яго насельнікаў падначальвалася галоўнай мэце: абараніць свой дом. Пачынаецца мураванае абарончае дойлідства ў Наваградку і Гародні. Перасяленцаў з Прусіі Тройдзень выкарыстоўвае ў сістэме абароны, яны даглядаюць масты і дарогі, нясуць вартавую службу. Дружыны Тройдзеня не толькі адбіваюцца ад ворагаў, але і робяць паходы на варожую зямлю, дзе бяруць у аблогу гарады і замкі. Тройдзень наладжвае саюзныя адносіны з Мазовіяй, замацаваўшы іх шлюбам сваёй дачкі з мазавецкім князем. Пэўна, пры Тройдзеню да ВКЛ была далучана Дайноўская зямля з Райгародам у басейне ракі Бебжа. Усе гэта сведчыць аб пэўнай жыццястойкасці дзяржаўнага арганізму ВКЛ, даволі трывалай уладзе яе правіцеля. Мяркуючы па тым, што галіцка-валынскі летапісец у самых змрочных фарбах апісвае Тройдзеня, называючы яго «окаяньный і базаконьный, проклятый, немилостивый», ён быў цвёрды аж да жорсткасці, хітры, рашучы і валявы правіцель. Толькі такі «окрутный і валечный» князь мог адбіць варожую пагрозу і захаваць сваю дзяржаву.

Паспяхова дзейнічаў Тройдзень і супраць крыжакоў. Хоць, па словах ордэнскага храніста, лівонскі магістр пахваляўся, што ўсмірыць нават Тройдзеня ліхога. Але сам князь у 1277 годзе прыйшоў у Лівонію пад сцены Дынабурга «ўціхамірваць» крыжакоў. Дынабург, які ўзвялі крыжакі непадалёк ад полацкай мяжы, непасрэдна пагражаў Полацку, таму было важна разбурыць гэтае асінае гняздо.

Чатыры тыдні доўжылася аблога замка. Тройдзеню дапамагалі лучнікі з Полацка, якія вызначаліся трапнай стральбой. Выкарыстоўваліся каменямёты і рухомыя штурмавыя вежы, што красамоўна сведчыць аб прымяненні дасягненняў тагачаснай ваеннай тэхнікі. Аблогу давялося спыніць, бо на паўднёвых межах дзяржавы гучаў бразгат варожай зброі, і трэба было рыхтавацца да абароны ад татара-мангольскага і галіцка-валынскага нашэсця.

Тройдзень вызначаўся дзейснай натурай. Толькі адбіўся ад аднаго нашэсця, як на пачатку 1279 года лівонскія рыцары ўварваліся ў Жамойць і агнём і мячом спустошылі яе. Князь сабраў моцнае войска і нагнаў крыжакоў ужо ў Лівоніі, дзе 5 сакавіка ў бітве пад Ашэрадэнам разбіў іх ушчэнт. Загінуў сам магістр Эрнэст фон Рацэбург і 71 рыцар (больш чым у славутай Неўскай бітве). Перамога выклікала паўстанне супраць крыжакоў падняволеных прусаў, яцвягаў і земгалаў, якіх падтрымаў Тройдзень.

Тайнай схавана смерць Тройдзеня. Паводле некаторых звестак, ён загінуў ад забойцаў, падасланых пскоўскім князем Даўмонтам. Аднак летапісец мог пераблытаць гэтага Даўмонта з яго цёзкам, які пад 1285 годам у летапісах названы вялікім князем. Значыць, ён пасля смерці Тройдзеня ў 1283 годзе і зрабіўся правіцелем ВКЛ. Правіў ён нядоўга і ў 1285 годзе загінуў у баі з рускімі дружынамі. Магчыма, ён прыйшоў да ўлады праз забойства Тройдзеня.

Смерць Тройдзеня не прывяла да падзення Вялікага Княства Літоўскага. Яно было даволі моцным, і змена ўлады не стала для дзяржавы фатальнай. У гэтым ёсць заслуга і Тройдзеня.

Вітаўт ЧАРОПКА.

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении 12.05.2017 года аукционных торгов по продаже права заключения договора аренды на три года части административно-торгового помещения с инв. №500/D-1005445 площадью 158,9 кв. м, проводимых в электронной форме на электронной торговой площадке «ТОРГИБЕЛ»

Номер лота: 210217001
Краткая характеристика Объекта, право заключения договора аренды которого, выставлено на аукцион:
Изолированное помещение с инвентарным номером 500/D-1005445.
Наименование: Административно-торговое помещение.
Назначение: Административно-торговое помещение.
Площадь, сдаваемая в аренду – 158,9 кв. м
Этаж: первый.
Местонахождение Объекта: г.Минск, ул. Буденного, 11-1Н.
Продавец (собственник), организатор электронных торгов:
Республиканское унитарное предприятие «Комплекс по оказанию услуг имени П. М. Машерова» 220004, г. Минск, пр. Победителей, 23/3-6, каб. 503, р/с 3012215540017 в ОАО «Паритетбанк» ОПЕРУ, код 782, г. Минск, пр-т Независимости, 77, ОКПО 381661635000, УНП 192240128.
Тел./факс: 219-48-21, 306-47-35.
Оператор ЭТП:
Республиканское унитарное предприятие «Институт недвижимости и оценки», 220030 г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, помещение 9.
Адрес ЭТП: http://торги.бел.
Начальная цена предмета электронных торгов (с учетом НДС): 815,25 белорусского рубля (Восемьсот пятнадцать белорусских рублей 25 копеек).
Шаг торгов: 5 процентов от начальной цены предмета электронных торгов.
Сумма задатка: 81,53 белорусского рубля (Восемьдесят один белорусский рубль 53 копейки).
Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом ЭТП «ТОРГИБЕЛ» (далее – Регламент) и Положения о порядке проведения электронных торгов по продаже государственного имущества, включая земельные участки, права заключения договора аренды государственного имущества, в том числе земельных участков», утвержденных постановлением Совета Министров РБ №608 от 12 июля 2013 г.
Для участия в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом, пройти аккредитацию на ЭТП по электронному адресу http://торги.бел, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.
Задаток перечисляется на расчетный счет РУП «Институт недвижимости и оценки» №3012154337078 в ОАО «БПС-Сбербанк» г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 153001369, не позднее срока окончания приема документов на участие в электронных торгах.
Дата и время начала проведения электронных торгов:
12.05.2017 года в 11.00 (по времени на сервере ЭТП «ТОРГИБЕЛ»).
1. Победитель электронных торгов либо в случае, если электронные торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в торгах подано только одним участником, и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) (Претендент на покупку), обязан оплатить полную стоимость приобретенного предмета электронных торгов не позднее 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола электронных торгов.
2. Победитель электронных торгов (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение электронных торгов на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах электронных торгов.
3. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя электронных торгов.
Договор аренды между продавцом и победителем электронных торгов (претендентом на покупку) заключается после предъявления продавцу копий платежных документов о перечислении суммы затрат на организацию и проведение электронных торгов и подписывается не позднее 10 рабочих дней со дня проведения электронных торгов.
Сумма арендной платы в месяц: 3 261,01 (Три тысячи двести шестьдесят один белорусский рубль 01 копейка).
Расчет ежемесячной арендной платы выполнен в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 29 марта 2012 г. №150 «О некоторых вопросах аренды и безвозмездного пользования имуществом». Базовая арендная величина с 01.04.2017 равна 15 руб. 20 коп.
Прием заявлений на участие в электронных торгах с прилагаемыми документами осуществляется по 05.05.2017 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 по адресу: 220030 г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, помещение 6
Дата и время окончания срока подачи заявок: 05.05.2017 в 15.00.
Детальная информация о порядке участия в электронных торгах размещена на сайте ЭТП «ТОРГИБЕЛ». По вопросу ознакомления с Объектом аукциона следует обращаться по телефонам: (017)219-48-21, 306-47-35

Телефоны для справок: (РУП «ИНО») (017) 306-00-57, (029) 550-09-70;
(РУП «Комплекс по оказанию услуг имени П. М. Машерова») (017)219-48-21, 306-47-35.

ОАО «КРУПСКИЙ ПЛОДООВОЩНОЙ ЗАВОД»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Лот №1	
Предмет торгов	**Комплекс зданий и оборудования для производства плодоовощной продукции (одним лотом):** производственный корпус (613/С-13477) 201,6 кв. м, гараж на 4 бокса (613/С-13484) 119,5 кв. м, гараж на 2 бокса (613/С-13483) 46,2 кв. м, здание цеха для брожения вина (613/С-13526) 157,7 кв. м, здание цеха по переработке яблок (613/С-13528) 249,2 кв. м, здание цеха безалкогольных напитков (613/С-13527) 416,2 кв. м, здание кисельного и горчичного цеха (613/С-13481) 813,6 кв. м, здание мастерских (613/С-13478) 169,8 кв. м, здание погреба (613/С-13482) 47,4 кв. м, здание котельной (613/С-13485) 199 кв. м, здание спиртохранилища (613/С-13479) 104,4 кв. м, здание проходной (613/С-13480) 54,1 кв. м, здание склада материальных ценностей (613/С-10557) 250 кв. м, здание арочника №1 (613/С-10558) 490,0 кв. м, здание арочника №2 (613/С-10559) 490,0 кв. м, водонапорная башня (613/С-13560), артезианская скважина (613/С-13559), оборудование согласно перечню, размещенному на сайте http://sites.google.com/site/pcjuristcom/home Земельный участок №623050100001002242 предоставлен для обслуживания зданий и сооружений производственный базы на праве аренды площадью 1,85 га
Местонахождение предмета торгов: **Минская обл., г. Крупки, ул. Московская, д. 1** Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. Контактное лицо для осмотра объекта торгов: +37544 552 42 92 Андрей	
Начальная цена с НДС 20%	561 803,45 белорусского рубля
Задаток	56 180,35 белорусского рубля
Шаг аукциона	5%
Организатор торгов	ООО «Фрондера», +37529 395 36 35
Информация о продавце	ОАО «Крупский плодоовощной завод» Минская обл., г. Крупки, ул. Московская, д. 1 (ликвидатор – ООО «Партнер-Консультант», г. Минск, ул. Мележа, д. 1, оф. 1122)
Дата и время проведения аукциона	**12 мая 2017 года в 14.00** по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 11, конференц-комната №609
Условия для участия в торгах	1. До подачи заявления внести задаток на р/с №3012221557014 в ЗАО «Альфа-Банк», код банка 270, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту №1, проводимых 12.05.2017. 2. Подать заявление на участие в торгах, документ, подтверждающий внесение суммы задатка с отметкой банка. К заявлению на участие в торгах прилагаются документы согласно п. 12 Положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 №16. Образец заявления и перечень документов можно посмотреть на сайте https://sites.google.com/site/pcjuristcom/informacia-o-torgah 3. Лица, желающие принять участие в аукционе и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Договор купли-продажи заключается между продавцом и победителем аукциона (приравненным к нему лицом) в белорусских рублях в течение 5 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть проведена в полном объеме не позднее 10 рабочих дней с даты подписания договора купли-продажи. Также победителем подлежат возмещению затраты по организации и проведению торгов в размере 5% от начальной стоимости объекта торгов, а также затраты по размещению публикации (согласно выставленному счету). 4. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5%, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона

КРЫВАВАЯ ПЯТНІЦА СТАКГОЛЬМА

ЯК СПЫНІЦЬ ЖУДАСНУЮ ХВАЛЮ ТЭРАРЫЗМУ?

На поўначы Еўропы адзін за адным адбыліся два буйныя тэракты. Услед за Пецярбургам тэрор прыйшоў у Швецыю. 7 красавіка стала яшчэ адным чорным днём найноўшай еўрапейскай гісторыі. У мінулую пятніцу ў 14.53 па мясцовым часе ў цэнтры Стакгольма адбыўся напад на людзей. Загінулі чатыры чалавекі (у тым ліку адзінаццацігадовая дзяўчынка), яшчэ 15 атрымалі раненні. Шведскі прэм'ер-міністр назваў тое, што адбылося, тэрарыстычнай атакай. Што супрацьпаставіць чарговаму выкліку Стары Свет?

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ад імя беларускага народа і сябе асабіста выказаў спачуванні каралю Швецыі Карлу XVI Густаву, родным і блізкім загінулых падчас тэракта ў Стакгольме. Пра гэта паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара. «З болем і смуткам у Рэспубліцы Беларусь успрынялі паведамленне пра чалавечыя ахвяры ў выніку наўмыснага наезду грузавіка на людзей у цэнтры Стакгольма», — гаворыцца ў спачуванні. Кіраўнік дзяржавы выказаў шчырыя словы падтрымкі ўсяму народу Швецыі, а таксама пажадаў хуткага выздараўлення пацярпелым.

Як паведамілі ў прэс-службе МЗС, грамадзяне Беларусі падчас тэракта ў Стакгольме не пацярпелі.

Жах на Дротнінгатане

Для нападу выкарыстоўваўся грузавік, украдзены ў мясцовай піваварнай кампаніі. Яе прадстаўнікі паведамілі, што машына знікла, пакуль вадзіцель заносіў тавар у рэстаран. Згоншчык прамчаўся шэсць кварталаў, выехаў на ажыўленую пешаходную вуліцу Стакгольма — Дротнінгатан (адну з галоўных славутасцяў сталіцы Швецыі, размешчаную за 700 метраў ад урадавага квартала). Тут ён знёс невялікія агароджы перад пешаходнай часткай і пачаў душыць людзей на

тратуары. Пасля чаго, як мяркуецца, каб павялічыць колькасць ахвяр, урэзаўся ў вітрыну гандлёвага цэнтра Ahlens.

Цэнтр Стакгольма адразу натапырыўся барыкадамі, узведзенымі вартавымі парадку. Улады спынілі грамадскі транспарт, уключаючы наземныя і падземныя цягнікі. Паліцыя эвакуіравала цэнтральны чыгуначны вакзал, размешчаны непадалёку ад месца тэракта. На шматлікіх відэакадрах было бачна, як сотні людзей разбягаюцца ў розныя бакі ў страху за сваё жыццё. Некаторыя відавочцы таксама казалі аб гуках стрэлаў, але гэтая інфармацыя не пацвердзілася.

Пасля на прэс-канферэнцыі кіраўнік паліцыі Швецыі Дан Эліясан заявіў, што ведамства шукае падазраванага ў здзяйсненні тэракта ў Стакгольме, апублікавана яго фатаграфія з камер назірання. Па гэтай арыенціроўцы затрымалі 39-гадовага грамадзяніна Узбекістана. SVT (Sveriges Television —- шведскае тэлебачанне) са спасылкай на прэс-сакратара паліцыі Ларса Байстрама пацвердзіла, што, хутчэй за ўсё, затрымалі вадзіцеля грузавіка, у машыне знайшлі ўзрыўчатку.

Газета Aftonbladet паведаміла, што на яго старонцы ў Facebook былі апублікаваны прапагандысцкія фільмы «Ісламскай дзяржавы», а таксама фота акрываўленых людзей, якія пацярпелі пасля выбуху на Бостанскім марафоне ў ЗША. SVT звязалася з сяброўкай падазраванага, якая расказала, што ў затрыманага чацвёра дзяцей, ён працуе будаўніком. Ён ніколі не абмяркоўваў палітыку альбо рэлігію, а толькі дадатковыя падпрацоўкі, якія дазволілі б адпраўляць больш грошай на радзіму сям'і.

Аўто-забойцы

Тэракты на аўтамабілях у Старым Свеце цяпер не рэдкасць. Здарэнне ў Стакгольме — пятае менш чым за год. Летась 14 ліпеня на набярэжнай у Ніцы, дзе на салют з нагоды святкавання Дня ўзяцця Бастыліі сабралася мноства людзей, грузавік на хуткасці ўрэзаўся ў натоўп і праехаў каля двух кіламетраў па зігзагападобнай траекторыі. Вадзіцеля ў рэшце рэшт застрэлілі супрацоўнікі паліцыі. У выніку тэракта загінулі 86 чалавек, больш за 300 атрымалі раненні. Адказнасць за злачынства ўзяла групоўка «Ісламская дзяржава».

19 снежня 2016 года грузавік з прычэпам урэзаўся ў натоўп наведвальнікаў каляднага кірмашу ў Берліне. Ён праехаў па тэрыторыі каля 80 метраў, у выніку чаго загінулі 12 чалавек, яшчэ 48 пацярпелі. У кабіне знаходзіўся пасажыр, які загінуў. Аб'яўлены ў вышук падазраваны, 24-гадовы грамадзянін Туніса, які кіраваў аўтамабілем, пазней быў забіты ў Мілане ў перастрэлцы з паліцыяй. Тэрарыст быў звязаны з групоўкай «Ісламская дзяржава».

Сёлета 22 сакавіка мужчына на пазадарожніку збіў некалькі чалавек на Вестмінстэрскім мосце ў Лондане. Пасля гэтага ён заехаў у агароджу брытанскага парламента і паспрабаваў патрапіць на яго тэрыторыю. Адзін з паліцэйскіх імкнуўся спыніць злачынцу, аднак у ходзе барацьбы атрымаў смяротнае нажавое раненне. Нападнік быў застрэлены іншым паліцэйскім. За рулём машыны знаходзіўся 52-гадовы брытанец Халід Масуд. У выніку здарэння загінулі пяць чалавек, яшчэ больш за 50 — атрымалі раненні. Адказнасць за напад узяла на сябе зноў-такі ІД. Ужо на наступны дзень — 23 сакавіка — у бельгійскім Антверпене мужчына заехаў у натоўп і быў затрыманы паліцыяй. У яго машыне знайшлі траўматычную зброю.

Дарэчы, за першыя месяцы 2017 года ў Ізраілі адбылося шэсць тэрактаў з выкарыстаннем транспартных сродкаў. Часцей за ўсё ў такіх выпадках работнікі праваахоўных органаў адразу ж адкрываюць агонь на паражэнне, што дазваляе пазбегнуць вялікай колькасці ахвяр.

Прадухіліць немагчыма?

На думку многіх жыхароў Швецыі, рана ці позна нешта падобнае магло адбыцца. Апошнім часам сотні маладых шведаў ездзілі ў Сірыю і ваявалі на баку «Ісламскай дзяржавы». Паўночнае каралеўства лічыцца адным з галоўных еўрапейскіх пастаўшчыкоў наймітаў для джыхадзістаў. Па звестках паліцыі бяспекі, 292 грамадзяніны краіны пакінулі Швецыю з 2013 года з тым, каб далучыцца да тэрарыстычнай групоўкі «Ісламская дзяржава». 133 з іх ужо вярнуліся назад у каралеўства.

Летась парламент Швецыі прыняў закон «Аб барацьбе з тэрарызмам», які ўзмацніў жорсткасць нормаў, што дзейнічаюць у краіне. Новыя меры прадугледжваюць два гады пазбаўлення волі за паездкі за мяжу з мэтай далучыцца да тэрарыстычнай групоўкі і шэсць гадоў турмы за навучанне ў трэніровачных лагерах тэрарыстаў. Фінансаванне тэрарыстычных груповак караецца пазбаўленнем волі на тэрмін да двух гадоў. Новыя правілы дзейнічаюць з 1 красавіка 2016 года. У той жа час рыксдаг адхіліў вынесеную партыяй «Шведскія дэмакраты» прапанову аб пазбаўленні грамадзянства асоб, асуджаных за тэрарызм. Магчыма, цяпер нормы зноў будуць скарэктаваны.

«Па прыкладзе Ізраіля, еўрапейцам трэба навучыцца жыць ва ўмовах пастаяннай тэрарыстычнай пагрозы, прычым гэтыя ўрокі нельга адкладаць на аддаленую будучыню», — лічыць экс-міністр па справах спецслужбаў урада Чэхіі Яраслаў Башта. Прадухіліць тэракты немагчыма, але да гэтага трэба імкнуцца. «Як вядома, генералы заўсёды рыхтуюцца да мінулай вайны, а ўлады імкнуцца падкласці дошчачку прыкладна ў такім месцы, дзе спатыкнуўся сусед», — кажа Башта, маючы на ўвазе, у прыватнасці, тэрміновае збудаванне ў шэрагу сталіц бетонных перашкод пры ўездах на цэнтральныя плошчы, а таксама з'яўленне на вуліцах дадатковых нарадаў паліцэйскіх.

На думку Башты, падобныя меры разлічаны хутчэй на заспакаенне ўласнага насельніцтва, чым на прадухіленне тэрактаў з выкарыстаннем цяжкіх грузавікоў. «Галоўную ролю ў барацьбе з міжнародным тэрорам наканавана адыгрываць спецслужбам, прычым у цесным узаемадзеянні з калегамі ў іншых краінах і рэгіёнах свету. Па той інфармацыі, якая час ад часу прасочваецца ў СМІ розных краін, можна зрабіць выснову, што і на гэтым узроўні дапускаецца нямала памылак», — адзначае чэшскі эксперт. Чаго варты, па яго словах, хоць бы той факт, што «берлінскі тэрарыст» Аніс Амры ў 2015 годзе быў на кручку ў нямецкай контрразведкі і кваліфікаваны ёю як «патэнцыйная пагроза». Аднак спецслужбы ў выніку палічылі яго «ўсяго толькі» шараговым распаўсюджвальнікам наркотыкаў і выпусцілі са свайго поля зроку. Прычым гаворка ў гэтым выпадку ідзе пра памылку контрразведчыкаў Германіі, якія лічацца знаўцамі ў сваёй справе.

«Тэрарысты, нават якія здзяйсняюць свае акцыі ў адзіночку, на самай справе цесна звязаны з пэўным колам саўдзельнікаў. У іх заўсёды ёсць свая база, свой тыл. У гэтым асяроддзі фарміруюцца іх светапогляд, характар, адбываецца падрыхтоўка да баявых акцый», — кажа Башта. Як мяркуе эксперт, падобнай базай часта з'яўляюцца так званыя шэрыя зоны, якія ёсць у многіх буйных гарадах Заходняй Еўропы і ЗША. Гаворка ідзе пра раёны пражывання мігрантаў, у якія мясцовыя паліцэйскія наведваюцца без вялікай ахвоты, аддаючы гэтыя прасторы на водкуп злачынным элементам, удакладняе эксперт.

З мэтай падтрымання неабходнага грамадскага парадку ў рамках барацьбы з міжнародным тэрарызмам органам ЕС у цэлым і кожнай з асобных еўрапейскіх краін, на думку эксперта, мабыць, ужо ў аглядныя будучыні трэба будзе пайсці на змены ў заканадаўстве, на ўмацаванне рэпрэсіўных кампанентаў улады, такіх, як паліцыя і спецслужбы, а таксама армія, уключаючы павелічэнне іх колькасці і паляпшэнне матэрыяльнай базы. Дзяржавы дзеля абароны сваіх грамадзян павінны быць «эгаістамі».

Захар БУРАК. *burak@zviazda.by*

ОАО «ЭЛЕГАНТ» г. Жодино, УНП 600039318

222161, г. Жодино, пр. Ленина, 22

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС

на 31 декабря 2016 года *(тыс. руб.)*

Активы	Код строки	На 31 декабря 2016 года	На 31 декабря 2015 года
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	598	566
Нематериальные активы	120	-	-
Доходные вложения в материальные активы	130	-	-
В том числе: инвестиционная недвижимость	131	-	-
Предметы финансовой аренды (лизинга)	132	-	-
Прочие доходные вложения в материальные активы	133	-	-
Вложения в долгосрочные активы	140	285	280
Долгосрочные финансовые вложения	150	1 151	51
Отложенные налоговые активы	160	-	-
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	-	-
Прочие долгосрочные активы	180	-	-
ИТОГО по разделу 1	**190**	**2 034**	**897**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	85	119
В том числе: материалы	211	15	9
Животные на выращивании и откорме	212	-	-
Незавершенное производство	213	-	-
Готовая продукция и товары	214	70	110
Товары отгруженные	215	-	-
Прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	-
Расходы будущих периодов	230	34	33
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	-	-
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	106	81
Краткосрочные финансовые вложения	260	175	259
Денежные средства и их эквиваленты	270	78	55
Прочие краткосрочные активы	280	-	-
ИТОГО по разделу II	**290**	**478**	**547**
БАЛАНС	**300**	**2 512**	**1 444**
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	8	8
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	1	1
Добавочный капитал	450	495	495
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	800	686
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	-	-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**1 304**	**1 190**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	**510**	**-**	**-**
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	**520**	**-**	**-**
Отложенные налоговые обязательства	530	-	-
Доходы будущих периодов	540	-	-
Резервы предстоящих платежей	550	-	-
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
ИТОГО по разделу IV	**590**	**-**	**-**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	-	-
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	1 093	-
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	113	252
В том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	3	-
по авансам полученным	632	41	35
по налогам и сборам	633	34	48
по социальному страхованию и обеспечению	634	3	-
по оплате труда	635	19	142
по лизинговым платежам	636	-	-
собственнику имущества (учредителям)	637	-	-
прочим кредиторам	638	13	27
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	2	2
Резервы предстоящих платежей	660	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	-	-
ИТОГО по разделу V	**690**	**1 208**	**254**
БАЛАНС	**700**	**2 512**	**1 444**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

за январь–декабрь 2016 г. *(тыс. руб.)*

Наименование показателей	Код строки	За январь – декабрь 2016 года	За январь – декабрь 2015 года
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	744	715
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(96)	(69)
Валовая прибыль (010-020)	030	648	646
Управленческие расходы	040	(305)	(581)
Расходы на реализацию	050	-	-
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, услуг (030-040-050)	060	343	65
Прочие доходы по текущей деятельности	070	1	2
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(183)	(41)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности	090	161	26
Доходы по инвестиционной деятельности	100	75	93
В том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	-	1
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	-	-
проценты к получению	103	43	89
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	32	3
Расходы по инвестиционной деятельности	110	(59)	(5)
В том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	-	-
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	(59)	(5)
доходы по финансовой деятельности	120	-	-
В том числе: курсовые разницы от перерасчета активов и обязательств	121	-	-
прочие доходы по финансовой деятельности	122	-	-
Расходы по финансовой деятельности	130	-	-
В том числе: проценты к уплате	131	-	-
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	-	-
прочие расходы по финансовой деятельности	133	-	-
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности	140	16	88
Прибыль (убыток) до налогообложения	150	177	114
Налог на прибыль	160	(63)	(5)
Изменение отложенных налоговых активов	170	-	-
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	-	6
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли	190	-	-
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли	200	-	-
Чистая прибыль (убыток)	210	114	109
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	-	-
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток)	240	114	109
Базовая прибыль (убыток) на акцию	250	-	-
Разводненная прибыль (убыток) на акцию	260	-	-

Информация об открытом акционерном обществе и его деятельности по состоянию на 01.01.2017 года

Доля государства в уставном фонде – нет

Количество акционеров, всего 41, в том числе юридических лиц – 6, из них нерезидентов Республики Беларусь – 1, физических лиц – 35, из них нерезидентов Республики Беларусь – нет.

Сведения о применении эмитентом свода правил корпоративного поведения: применяется Регламент работы Общества с реестром владельцев ценных бумаг, Положение об аффилированных лицах Общества.

Показатель	Единица измерения	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	тысяч рублей	0	0
Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде	тысяч рублей	0	0
Дивиденды, приходящиеся на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги)	рублей	0	0
Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа__	рублей	0	0
Дивиденды, приходящиеся на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа__	рублей	0	0
Дивиденды, фактически выплаченные на одну простую (обыкновенную) акцию (включая налоги)	рублей	0	0
Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) первого типа	рублей	0	0
Дивиденды, фактически выплаченные на одну привилегированную акцию (включая налоги) второго типа	рублей	0	0
Период, за который выплачивались дивиденды	месяц, квартал, год	-	-
Дата (даты) принятия решений о выплате дивидендов	число, месяц, год	-	-
Срок (сроки) выплаты дивидендов	число, месяц, год	-	-
Обеспеченность акции имуществом общества	рублей	15,76	14,38
Количество простых акций, находящихся на балансе общества	штук	0	0
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	тысяч рублей	744	715
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг, управленческие расходы, расходы на реализацию	тысяч рублей	401	650
Прибыль (убыток) до налогообложения, всего (прибыль (убыток) отчетного периода)	тысяч рублей	177	114
В том числе: прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг	тысяч рублей	343	65
прочие доходы и расходы по текущей деятельности	тысяч рублей	(182)	(39)
прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности	тысяч рублей	16	88
